Казак, Таццяна. Гродзенскі музей і лёс яго заснавальніка. Частка I і Частка II // http://harodnia.com/be/uczora/hrodna-1920-1944/. – 27.04.2015.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей быў створаны дзякуючы намаганням сапраўднага прафесіянала музейнай справы – **Юзафа Ядкоўскага** (1890-1950). У 20-30-я гады XX ст. музей меў назву **Muzeum w Grodnie (Państwowy Muzeum w Grodnie) – Музей у Гродне (Дзяржаўны музей у Гродне)**.

Музей стаў адметнай часткай культурнага жыцця горада і істотна ўплываў на свядомасць мясцовых жыхароў. Ён фарміраваў гістарычныя ўяўленні гараджан у адпаведнасці з пэўнымі навуковымі і ідэалагічнымі канцэпцыямі. Юзаф Ядкоўскі як дырэктар музея павінен быў стаць апорай польскай ідэалогіі на "крэсах усходніх". Але ён, як сапраўдны даследчык, разумеў адметнасць культуры Гродзеншчыны, дзе з даўніх часоў жылі побач розныя народы, якія стваралі непаўторнасць гісторыі і культуры рэгіёну. Таму дзейнасць музея, дзякуючы намаганням Ю.Ядкоўскага, не мела выключна прапольскай арыентацыі, а была накіравана на даследаванне гісторыі і культуры прадстаўнікоў розных народаў, якія жылі ў гэтым краі.

У артыкуле разглядаецца першы перыяд існавання музея, калі ён толькі пачынаў сваю дзейнасць: фарміраваў фондавыя калекцыі, ствараў першыя пастаянныя экспазіцыі, арганізоўваў выстаўкі, выдаваў справаздачы аб выніках працы, археалагічных даследаваннях і публікаваў навуковыя артыкулы, рабіў захады па пераводу і ўладкаванню музея ў Старым замку.



У гэтым будынку нарадзіўся Ю. Ядкоўскі

31 кастрычніка 1918 г. урадам Польшчы быў прыняты дэкрэт па апецы над помнікамі. Паводле яго на месцах ствараліся камісіі апекі над помнікамі.
На пасяджэнні кіраўнікоў акруг і шэфаў секцыі Грамадзянскага кіраўніцтва Усходніх зямель 22 студзеня 1920 г. была прынята пастанова аб арганізацыі нагляду над гістарычнымі помнікамі (у першую чаргу нерухомымі помнікамі). На падставе гэтага рашэння ў Гродне пры павятовым кіраўніцтве была створана Камісія апекі над помнікамі мастацтва і культуры.




Бюст Станіслава Аўгуста Панятоўскага з дамініканскага касцёла

Арганізацыйны сход, які адбыўся 12 сакавіка 1920 г. па ініцыятыве гродзенскага старасты Казіміра Рагалевіча, зацвердзіў склад Камісіі. У яе ўвайшлі інжынер В.Герман, мастак Ю.Ванатоўскі, архіварыус былога губернскага архіва А.Гедройц, скульптар Ю.Вільк, нумізмат Л.Вільконскі. Кіраўніком і сакратаром камісіі быў прызначаны гісторык мастацтва і археолаг Ю.Ядкоўскі. Для Камісіі быў вызначаны бюджэт на 6 месяцаў, які склаў 120 тыс. марак польскіх, і асобна 20 тысяч выдзялялася на арганізацыю бюро Камісіі.

Камісія часова была размешчана ў будынку былога губернскага архіва. Сябры Камісіі прынялі рашэнне, паводле якога планавалася пераехаць у той будынак, дзе размесціцца гарадскі музей. Стварэнне музея было адной з галоўных задач Камісіі. Самым лепшым месцам для такой установы з'яўляўся, бясспрэчна, Стары замак.



Малады Ю. Ядкоўскі

Камісія апекі над помнікамі мастацтва і культуры занялася пошукам і зборам помнікаў культуры і гісторыі, акрамя гэтага на яе лёг цяжар аховы і рэстаўрацыі помнікаў. У сакавіку 1920 г. Камісія разглядала, напрыклад, пытанне даследавання царквы былога базыльянскага жаночага манастыра, якая была пашкоджана ў 1915 г.

Камісія вяла нагляд і за помнікамі ў павеце. Так, 17 сакавіка 1920 г. начальнік III раёна Гродзенскага павета паведамляў Камісіі аб помніках у Камянецкай гміне: – абяліску каля маёнтка Аляшэвічы і старым памежным слупе на граніцы павета.

Фонд будучага музея пастаянна павялічваўся. Камісіі з розных мясцін прывозілі старажытныя кнігі і рэчы. Ёй былі перададзены калекцыі педагагічнага музея (мінералагічная, геалагічная і арніталагічная), прывілей караля Аўгуста III цэху гродзенскіх рыбакоў, старадаўні вялікі жалезны ключ, які захоўваўся ў скарбонцы павятовай касы ў Гродне. Камісія вяла пошук старадаўніх кніг і дакументаў, прымала захады для набыцця часткі бібліятэкі дамініканскага кляштара, якая знаходзілася ў канцылярыі парафіі Фарнага касцёла. Ю.Ядкоўскі ў пошуках старадрукаў наведваў кнігарні горада. Былі выпадкі, калі ён знаходзіў старадаўнія дакументы, якія выкарыстоўвалі як абгортачную паперу. У выніку вялікая колькасць дакументаў, рукапісаў і кніг была перададзена Камісіі. 16 чэрвеня 1920 г. на некалькіх фурманках у будынак староства, дзе са згоды старасты К.Рагалевіча Камісія атрымала пад музейны збор чатыры пакоі (90, с.15), прывезлі звязкі дакументаў і кніг, якія знайшлі ў гродзенскіх крамах. Сярод набыткаў было шмат каштоўных выданняў з гродзенскіх езуіцкай і дамініканскай бібліятэк.



Малюнак Мірскага замка Ю.Ядкоўскага

Праца Камісіі перарвалася ў ліпені 1920 г., калі падчас савецка-польскай вайны ў Гродна ўвайшоў 3-ці конны корпус Чырвонай Арміі. Напярэдадні самыя каштоўныя зборы Камісіі былі змешчаны ў дзесяць вялікіх скрыняў і вывезены Ю.Ядкоўскім, В.Германам і наместнікам гродзенскага старасты Я.Нітаслаўскім на станцыю Ласосна. 19 ліпеня ў тры гадзіны дня, калі савецкія войскі ўжо ўвайшлі ў горад, музейныя зборы былі эвакуіраваны ў г. Влацлавэк.

У Гродне быў створаны павятовы ВРК, пры якім дзейнічаў аддзел народнай адукацыі. У склад апошняга ўваходзіў культурна-асветніцкі аддзел, які 29 ліпеня выдаў распараджэнне, ў адным з параграфаў якога быў зварот да ўсіх асоб, якія маюць звесткі аб помніках мастацтва і старажытнасці, такіх як карціны, вазы, статуэткі, фарфор і г. д., паведаміць аб іх у сакратарыят. Асобам, якія жадаюць прапанаваць свае паслугі ў арганізацыі народнага музея, трэба было зарэгістравацца ў сакратарыяце па вул. Гарохавай у доме Гелера з 10 да 2-х гадзін па "савецкім часе". Па сутнасці, быў зроблены захад па зборы матэрыялаў для будучага музея. Кіравала гэтай працай секцыя выяўленчага мастацтва на чале з Н.Гардонам.

16 жніўня 1920 г. Н.Гардон падаў заяву ў аддзел культасветы з просьбай дазволіць паездку па павету з мэтай рэгістрацыі і прыняцця мер па ахове помнікаў мастацтва і старажытнасцей, якія засталіся ў маёнтках, пакінутых гаспадарамі

31 ліпеня аддзел народнай асветы звяртаўся да жыллёвага аддзела ВРК аб перадачы пад Народны мастацкі музей дома князя Чацвярцінскага па вул. Садовай, 20. Гэты зварот не быў задаволены, таму 5 жніўня загадчык секцыі аховы помнікаў даўніны зноў звяртаўся да загадчыка культасвета аб выдзяленні памяшкання пад музей. 16 жніўня музею быў перададзены дом Гелера па вул.Гарохавай, 4 (цяпер вул.Сацыялістычная). Частка камплектуемага фонду была размешчана ў публічнай бібліятэцы. Невядома, як выглядала экспазіцыя гэтага музея, ці ўвогуле яна была створана, таму што ўжо ў верасні ў горадзе былі польскія войскі.




Дом па вул. Гарохавай быў заняты польскімі афіцэрамі. Праз нейкі час зборы савецкага музея зніклі. Ю.Ядкоўскі вёў палеміку ў газеце “Echo Grodzienskie” аб гэтым марадзёрстве. Ён лічыў, што няважна, хто збіраў гэтыя каштоўнасці, галоўнае, што яны былі сведкамі гісторыі краю. Толькі частка прадметаў была знойдзена на даху дома па вул. Гарохавай. У ліпені 1921 г. з Влацлавека вярнуліся эвакуіраваныя калекцыі.

У тым жа 1921 г. Камісія апекі над помнікамі мастацтва і культуры аднаўляе сваю дзейнасць. Адзінай крыніцай паступлення фінансавых сродкаў для працы Камісіі стала Выстава помнікаў краю і старога Гродна (аўтары Ю.Ядкоўскі, Л.Вільконскі), якая была адчынена 18 верасня і працавала да 4 снежня 1921 года. Для выставы былі атрыманы каштоўныя матэрыялы з павету ад розных асоб: срэбныя манеты XV-XVI стст., партрэты паэта Нямцэвіча і яго бацькі ад Зоф’і Урсын-Нямцэвіч з Князевіч, шафа вуглавая М.К.Агінскага, слуцкі пояс, партрэт Т.Касцюшкі. Шэраг прадметаў прадставілі для выставы сябры Камісіі. 6 верасня выставу наведаў кіраўнік дзяржавы Юзаф Пілсудскі.

Гэта быў першы экспазіцыйны праект будучага музея. Каталога выставы мы не маем, але дакладна, што гэта быў выдатны збор каштоўных прадметаў. Да сённяшняга дня ў музеі знаходзіцца шэраг прадметаў, якія экспанаваліся на гэтай выставе, а потым перайшлі ў музейны фонд.




"Выстава помнікаў краю і старога Гродна" была адзінай выставай, арганізаванай Камісіяй за ўвесь перыяд яе дзейнасці. На жаль, яна не дала вялікіх фінансавых сродкаў. У выніку адсутнасць належнага фінансавання стала прычынай замаруджвання дзейнасці Камісіі, сябры якой сталі рэдка збірацца. Не спрыяла яе дзейнасці і сцвярджэнне недасведчанага кансерватара П.Слядзеўскага аб тым, што Камісія ўвогуле незаконна існуе. П.Слядзеўскі сцвярджаў, што дэкрэт аб апецы над помнікамі, які быў прыняты ў 1918 г., на Гродзенскі павет не распаўсюджваецца. Сітуацыю праясніў прыезд у Гродна прадстаўніка Міністэрства веравызнання і публічнай асветы.

13 чэрвеня 1922 г. у будынку староства адбылося пасяджэнне Камісіі апекі над помнікамі мастацтва і культуры, на якім прысутнічалі сябры Камісіі, прадстаўнікі Дэпартамента мастацтва, Аддзела помнікаў і музеяў, Аддзела дзяржаўных архіваў Міністэрства веравызнання і публічнай асветы і іншых дзяржаўных устаноў. На ім было прынята рашэнне аб утварэнні на аснове збораў Камісіі Дзяржаўнага музея пры Гродзенскім старостве. Дзейнасць музея распаўсюджвалася ў асноўным на Гродзенскі, Ваўкавыскі, Сакольскі, Беластоцкі, Бельскі, Аўгустоўскі, Сувалкаўскі і Сейненскі паветы. Музей атрымаў памяшканне ў будынку староства (сучаны адрас – вул. Ажэшка, 3). Кіраўніком музея быў прызначаны Ю.Ядкоўскі.

Справа арганізацыі дзейнасці музея амаль цалкам лягла на плечы Ю.Ядкоўскага, таму што ў пратаколе аб стварэнні музея былі ўказаны толькі пасады дырэктара і дазорцы. Дарэчы, у адных дакументах пасада Ю.Ядкоўскага пазначаецца як "дырэктар музея", у іншых – "кусташ" (захавальнік музея).



Герб Рэчы Паспалітай, выратаваны Ю. Ядкоўскім

Дзякуючы грашовай дапамозе гродзенскага старасты К.Рагалевіча, а таксама субсідыі Дэпартамента мастацтва і крэдытам Аддзела мастацтва і культуры Беластоцкага ваяводства, ў памяшканнях, прызначаных для музея, быў праведзены рамонт. Урачыстае адкрыццё музея адбылося 9 снежня 1922 года з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства веравызнання і публічнай асветы, гродзенскага старасты і сяброў Камісіі.

Экспазіцыя музея размясцілася ў тых жа пакоях, якія раней займала Камісія. Экспазіцыйная мэбля для музея была заказана і выканана ў гродзенскай школе рамёстваў. Для наведвальнікаў зборы музея сталі даступнымі ў студзені 1923 г. Памяшканні музея былі вельмі малымі і не маглі змясціць больш за 25 наведвальнікаў. Па гэтай прычыне экскурсійныя групы часта чакалі сваёй чаргі на вуліцы, да таго ж падлога ў памяшканнях трымалася на гнілых бэльках.
Музей быў адчынены для агляду толькі ў суботу і нядзелю з 11 да 15 гадзін. Тым не менш за 161 рабочы дзень у 1923 годзе музей наведаў 2651 чалавек, а ў 1924 годзе – 2038 чалавек.

Нягледзячы на нязручныя ўмовы працы, вядомасць музея расла. Аб ім пісалі не толькі мясцовыя газеты, але і агульнапольскія. "Ужо некалькі гадоў як у Гродне адчынены музей, – пісаў "Літаратурна-навуковы кур'ер" у 1925 г. – Ён утрымлівае багатыя зборы помнікаў і матэрыялаў, якія адносяцца да гісторыі ўсёй Гродзеншчыны. Заснавальнікам і кусташам музея з'яўляецца Юзаф Ядкоўскі,

вялікадушны дар якога ў выглядзе каштоўных і шматлікіх збораў стаў асновай музея.”

Што вядома аб заснавальніку музея? Юзаф Ядкоўскі нарадзіўся 20 снежня 1890 года ў Гродне. Паходзіў са старажытнага шляхецкага роду Ядкоўскіх, каталіцкага па веравызнанні, які вядомы ў ВКЛ з канца XV ст. Радавое гняздо – ваколіца Ёдкавічы ў Гродзенскім павеце. Ядкоўскія належалі да герба “Ляліва”. У выніку хуткага разгалінавання род Ядкоўскіх у Гродзенскім павеце збяднеў, здрабнеў і згубіў палітычнае значэнне ў краіне. Больш таго, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай частка прадстаўнікоў роду не змагла пацвердзіць сваё шляхецтва і была запісана ў саслоўе мяшчан. Відаць, продкі Ю.Ядкоўскага належалі да апошніх.

Яго бацька, таксама Юзаф, кіраваў сталярнымі майстэрнямі Упраўлення акруговых пошт і тэлеграфа. Маці, Зоф’я, паходзіла з Занеўскіх. Ядкоўскія мелі пяцёра дзяцей. Юзаф быў старэйшым. Сям’я жыла ў двухпавярховым доме № 16 па вул. Паштовай, які цалкам належаў бацьку. У доме размяшчалася прадуктовая крама, гадзіннікавая і сталярная майстэрні. Апошняя належала бацьку Ю.Ядкоўскага. На жаль, дом не захаваўся. Ён быў знесены падчас узвядзення будынка аблвыканкама ў 1966 годзе.




Ужо ў юнацкія гады Юзаф пачаў цікавіцца гісторыяй. Разам з сябрамі выязджаў у вандроўкі па ваколіцах Гродна. Ён наведваў Ружаны, Адэльск, Верхаўляны, Новы Двор, Альшанку, Хадароўку, Кузніцу, Сухаволю, Радзівонавічы, Папялуўку і іншыя мясціны, аб чым сведчаць нататкі аб вандроўках, пачынаючы з 1907 г. У гэтых мясцінах малады даследчык знаёміўся з помнікамі архітэктуры. Захаваліся запісы Ю.Ядкоўскага на рускай мове пра праваслаўныя помнікі ў Гродне – Пакроўскі сабор, Раства-Багародзіцкі манастыр. Гэта не магло не ўплываць на будучага даследчыка Панямоння, асобу, якая паважае ўсе культуры, а праз сваю працу прапагандуе мультыкультуралізм.

Значны ўплыў на станаўленне асобы Ю.Ядкоўскага аказалі яго выкладчыкі з Гродзенскай мужчынскай класічнай гімназіі. Яго настаўнікам быў вядомы гісторык Е.Ф.Арлоўскі, які падтрымліваў вучня ў яго захапленні гісторыяй краю. Пазней, ацэньваючы ўнёсак Е.Ф.Арлоўскага ў вывучэнне гісторыі Гродзеншчыны, Ю.Ядкоўскі справядліва падкрэсліваў самы галоўны недахоп прац гісторыка – недастатковае веданне польскай мовы, а таму выкарыстанне абмежаванай колькасці гістарычных

крыніц. Але менавіта ад настаўніка будучы даследчык атрымаў добрыя веды па гісторыі горада. Ён дазваляў найбольш таленавітым гімназістам чытаць выданні са збору дамініканскага кляштара, якія знаходзіліся ў бібліятэцы гімназіі. Сярод такіх вучняў былі Уладзіслаў Талочка і Юзаф Ядкоўскі.

Добра знаёмы быў Ю.Ядкоўскі з Элізай Ажэшка. Ён наведваў курсы, якія праводзіла пісьменніца, карыстаўся кнігамі з яе бібліятэкі. Яна дапамагла Ю.Ядкоўскаму ўладкавацца ў Варшаве, калі ў гімназіі ў яго пачаліся праблемы з-за польскіх патрыятычных настрояў і ўдзелу ў дзейнасці ППС. Там юнак і атрымаў сярэднюю адукацыю.

Яшчэ ў Гродзенскай гімназіі Ю.Ядкоўскі пасябраваў з У.Талочкам, будучым беларускім рэлігійным дзеячам і гісторыкам.
У.Талочка адным з першых у Вільні пачаў публічна ўжываць беларускую мову ў набажэнствах, публікаваў матэрыялы гістарычнай тэматыкі. У 1920-я гады падвяргаўся ўціску польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі. У музеі захоўваецца яго перапіска з Ю.Ядкоўскім па некаторых гістарычных пытаннях.

У гады вучобы ў гімназіі Ю.Ядкоўскі наладзіў добрыя сувязі з айцом Мікалаем Дзікоўскім, святаром Сафійскага сабора, дзе захоўваліся старадрукі XVI ст. Ён з захапленнем знаёміўся са старадаўнімі кірылічнымі выданнямі, пашыраў свае веды па гісторыі праваслаўя на Гродзеншчыне. Гэта паўплывала на яго навуковыя зацікаўленасці, пацвярджэннем можа служыць навуковая праца пра праваслаўныя абарончыя храмы.

Творчыя сувязі Ю.Ядкоўскі падтрымліваў з сябрам Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта Уладзімірам Манасеінам, які займаўся ваеннай гісторыяй. Ён праводзіў раскопкі на Замкавай гары, падчас якіх быў закладзены невялікі шурф і было знойдзена некалькі сярэднявечных манет. Адну з гэтых манет – дэнар У.Манасеін аддаў Ю.Ядкоўскаму. У музеі захоўваецца кніга з аўтографам гэтага даследчыка.

У Варшаве, пасля завяршэння вучобы, Ю.Ядкоўскі працаваў спачатку ў Археалагічным музеі, затым у Таварыстве аховы помнікаў, пазнаёміўся з шэрагам вядомых асоб, з якімі склаліся добрыя адносіны: мастаком Ф.Рушчыцам, археолагам В.Шукевічам, прафесарам Э.Маеўскім, археолагам З.Глогерам і інш.

Пачаўшы даследчыцкую працу ў музеях Пецярбурга і Масквы, Ю.Ядкоўскі напісаў першы артыкул у галіне музеязнаўства пра польскія гарматы ў зборах Артылерыйскага музея ў Пецярбурзе. Трэба адзначыць, што Ю.Ядкоўскаму было тады толькі 18 гадоў, а ён ужо выдаў на той час восем навуковых артыкулаў.




Напэўна, не выпадкова ён едзе вучыцца ў Маскву, а не ў Кракаў, як меркаваў раней. Выбар на карысць Масквы быў зроблены свядома, таму што маскоўскія бібліятэкі, музеі і архівы былі больш багатымі на матэрыялы па гісторыі Гродзеншчыны ў параўнанні з кракаўскімі.

Ю.Ядкоўскі з дзяцінства захапляўся маляваннем. У Маскве ён заканчвае мастацкую школу, там жа паступае ў Імператарскі Археалагічны інстытут. Падчас вучобы асаблівую цікавасць у яго выклікаюць гісторыя мастацтва сярэднявечча, нумізматыка. Пасля заканчэння інстытута ў 1912 годзе атрымлівае званне вучонага археолага і працу лабаранта ў інстытуце. У хуткім часе ён быў абраны сапраўдным членам Археалагічнага інстытута, абараніў дысертацыю “Літоўская грыўна”, але невядома, ці надрукаваў яе, таму што пачалася Першая сусветная вайна.

Ю.Ядкоўскі працуе ў музеі імя Румянцава, дзе складае інвентары польскіх каштоўнасцей, якія ўтрымліваюцца ў музейных зборах Масквы, і піша на гэту тэму працу. Пазней яму спатрэбяцца гэтыя веды. Так у 1931 годзе дзякуючы Ю.Ядкоўскаму быў вернуты ў Гродна з Масквы бюст Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які раней знаходзіўся ў дамініканскім кляштары.
У 1910 – 1914 гг. Ю.Ядкоўскі супрацоўнічаў з рознымі навуковымі таварыствамі, у тым ліку з Маскоўскім археалагічным таварыствам. Ён займаўся арганізацыяй з’ездаў расійскіх археолагаў, прымаў удзел у XV з’ездзе ў 1911 г. у Ноўгарадзе, дапамагаў П.С.Уваравай у арганізацыі XVI з’езда ў Пскове, які не адбыўся з-за пачатку вайны.

У гэты перыяд Ю.Ядкоўскі накіроўваўся ад імя таварыства ў Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні як дзяржаўны кансерватар. У межах выканання службовых абавязкаў ён планаваў займацца даследаваннямі і рэканструкцыяй замкаў у Троках, Медніках, Лідзе, Крэва і Міры. На старонках часопісаў “Древности” і “Русское слово” ён змяшчаў артыкулы, прысвечаныя абарончай архітэктуры ў “заходніх” губернях: Сынковіцкай царкве, цэрквам ў Супраслі і Маламажэйкаве, замкам ў Міры і Троках і інш.

Ю.Ядкоўскі, займаючы пасаду кансерватара, шмат зрабіў для захавання помнікаў гісторыі і культуры. У функцыі кансерватара ўваходзіў пошук помнікаў, іх кансервацыя, ахова. Згодна з прадпісаннямі для кансерватараў, Ю.Ядкоўскі, як прадстаўнік расійскага Археалагічнага інстытута, павінен быў збіраць усё самае каштоўнае з названых зямель у расійскія музеі. У сваю чаргу як чалавек, які нарадзіўся ў гэтай мясцовасці, ён імкнуўся ўсімі спосабамі захаваць каштоўныя прадметы ў мясцовых зборах.

Дзякуючы яго намаганням удалося ўратаваць каштоўны іканастас XVII ст. у царкве Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы ў Супраслі і касцёл з фрэскамі Лукаша Губля ў Гарадзішчы Пінскага павета. Калі ў 1910 годзе ў супрасльскай царкве вырашылі замяніць стары ўніяцкі іканастас, супраць гэтага выступіла П.С.Уварава і скіравала пратэст у Сінод. Ю.Ядкоўскі быў дэлегаваны ад інстытута з мэтай фіксавання памераў і выгляду іканастаса. Што да гарадзішчанскага касцёла, то мясцовыя ўлады меркавалі разабраць яго на цэглу, але, дзякуючы Ю.Ядкоўскаму, гэта справа дайшла нават да Сената. У выніку помнік захавалі.

Падчас працы ў расійскіх установах Ю.Ядкоўскі перапісваўся з практыкуючымі польскімі археолагамі, сярод якіх быў Вандалін Шукевіч, даследчык літоўска-беларускага памежжа. Захаваліся лісты Ю.Ядкоўскага да В.Шукевіча, у якіх ён распавядае аб планах працы ў Вільні. У сваю чаргу В.Шукевіч запрашаў яго прыняць удзел у археалагічных даследаваннях помніка каменнага веку каля в.Нача. Другі археолаг – Ю.Талька-Грынцэвіч – клікаў на раскопкі каля вёскі Ланкішкі (абодва помнікі знаходзяцца на тэрыторыі сучаснага Воранаўскага раёна).

Самастойныя археалагічныя даследаванні Ю.Ядкоўскі праводзіў у Ваўкавыску, Мігаве, Вялікай Бераставіцы, Суражы. У 1914 г. у вёсцы Берашты Гродзенскага павета Ю.Ядкоўскі знайшоў некалькі стаянак, раскапаў могілкі – так званы “Магільны рог”. Грошы на даследаванні атрымліваў не толькі ад Маскоўскага таварыства. Так на паездку ў Бершты ён атрымаў сродкі з польскай касы імя Мяноўскага ў Варшаве, якая займалася фінансаваннем навуковых прац.

Трывалыя творчыя кантакты склаліся ў Ю.Ядкоўскага з многімі вядомымі навукоўцамі з Вільні. Сярод іх былі Пётр Слядзеўскі, гісторык мастацтва, знаўца віленскага барока; Луцыян Узенбла, даследчык гісторыі старой Вільні; Вацлаў Гізберт-Студніцкі, дырэктар віленскага архіва; Тадэвуш Урублеўскі, вядомы адвакат, які цікавіўся гісторыяй масонаў у ВКЛ і Польшчы; Мечыслаў Ліманоўскі, тэатральны крытык і адначасова прафесар геаграфіі, будучы абаронца Ю.Ядкоўскага па выніках археалагічных прац у Гродне.

Кандыдатура Ю.Ядкоўскага на пасаду кусташа мастацкага музея была прапанавана

П.С.Уваравай, кіраўніком Маскоўскага археалагічнага таварыства, і міністрам асветы Л.А.Касо. Аднак гэту пасаду яму атрымаць не ўдалося, таму што расійскія ўлады не жадалі прымаць на ўплывовыя пасады палякаў і католікаў. Адмовіць Ю.Ядкоўскаму не маглі з-за пратэкцыі названых вядомых асоб, але прапанавалі ўмовы, пры якіх працаваць было немагчыма (вельмі нізкі заробак).
У 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна. Вядома, што ў верасні 1914 года Ю.Ядкоўскі быў у Гродне. У лісце да В.Шукевіча ён піша: "У Гродне ўмовы зусім іншыя: зусім няма цукру, солі і белага хлеба. Соль чорная ў кавалках [...]. Рух у Гродне вялікі, але не ў сувязі з жыццём [...], а ў сувязі з цікавымі этнаграфічнымі матэрыяламі, якія Гродна ад пачатку не бачыла [...].. Маю намер застацца і запісацца ў Чырвоны крыж [...]. Нават як санітар вырашыў жывым не аддавацца ў рукі прусакам [...]" . Ён сапраўды застаўся ў Гродне і працаваў санітарам у шпіталі, прымаў удзел у баях з нямецкай арміяй на Мазурскіх азёрах.

Пра лёс Ю.Ядкоўскага ў 1916-1919 гг. вельмі мала вядома. У 1919 г. ён стаў кіраўніком Бюро апекі над помнікамі мастацтва і культуры ў Гродне, якое дзейнічала ад грамадзянскага Упраўлення ўсходніх зямель.

У 1920 годзе служыў уланам дывізіі польскага войска, прымаў удзел у баях з бальшавікамі. Пасля дэмабілізацыі атрымаў пасаду кансерватара Беластоцкага ваяводства, адначасова займаў пасаду кіраўніка Аддзела мастацтва і культуры пры ваяводстве.

У гэты час Ю.Ядкоўскі піша адну з найбольш вядомых прац па гісторыі Гродна. Ідэя напісання такой кнігі ўзнікла яшчэ ў часы знаходжання ў Маскве. Кніга была падрыхтавана ў 1920 годзе, але доўга ішлі пошукі сродкаў на друкаванне. У выніку Ядкоўскі атрымаў грошы ад дэпартамента мастацтва Міністэрства рэлігіі і публічнай асветы і выдаў сваю працу ў віленскай друкарні пры кнігарні Ю.Завадскага ў 1923 г. Дэпартамент выдаў даследчыку ганарар – каля 3 млн. 800 тыс. марак, на якія Ю.Ядкоўскі змог заказаць сабе толькі касцюм і фрак.

Манаграфія "Гродна" складалася з дзвюх частак. Першая была прысвечана гісторыі горада ад старажытнасці да часоў, сучасных даследчыку. Другая частка апавядала пра помнікі архітэктуры: замкі, палацы, цэрквы і касцёлы. У кнізе былі змешчаны фатаграфіі і замалёўкі самога аўтара, здымкі вядомага фатографа Яна Булгака і гродзенскага фатографа Лейбы Гельгора.

У працы Ю.Ядкоўскі ўказвае на старажытнасць Гродна, які, па яго меркаванні, паходзіць з XI ст. Але ён не згаджаецца з думкай аб тым, што ўпамінанне аб горадзе ў 1127 г. мае адносіны да Гродна. Пазней, пасля археалагічных адкрыццяў на Замкавай гары, гэта дата стане пачаткам летапіснага Гродна, а Ю.Ядкоўскі ўвойдзе ў гісторыю як даследчык, які практычна даказаў старажытнасць горада Гродна.

Упершыню быў надрукаваны ў кнізе герб горада з выявай аленя Св. Губерта, пададзена яго гісторыя і апісанне. Выклікала цікавасць гіпотэза даследчыка аб смерці Св. Казіміра ў Гродне, аб чым раней не пісалі.

Як чалавек актыўнай грамадскай пазіцыі, Ю.Ядкоўскі хваляваўся за тагачасныя змены ў гістарычным абліччы горада. Напрыклад, ён піша, што "расійскія ўлады

імкнуліся забыць старадаўнія назвы вуліц, але і апошнім часам горад перажывае перыяд хворага маньяцтва ў дачыненні да назваў вуліц".

Асобную частку кнігі складае гісторыя помнікаў Гродна. Першай апісваецца гісторыя праваслаўнай царквы Св. Барыса і Глеба. Вядома, што Ю.Ядкоўскі звярнуў увагу на праваслаўную царкву па прычыне яе старажытнасці, але сам факт адлюстравання ў першую чаргу праваслаўнага помніка, а не каталіцкага, доказвае шырокі погляд даследчыка на гісторыю малой Радзімы.

Археалагічныя раскопкі, якія праводзіў Ю.Ядкоўскі на Замкавай гары ў Гродне, выклікалі вялікі рэзананс не толькі сярод спецыялістаў, але і сярод грамадскасці. Не ўсе ставіліся адназначна да методыкі прац даследчыка, якая была жорстка раскрытыкавана ў навуковых археалагічных колах. Ю.Ядкоўскі быў зняты з пасады кіраўніка прац на Замкавай гары. У выніку пасля 1 ліпеня 1937 г. даследчык назаўсёды пакідае Гродна, пераязджае ў Варшаву.
Перад ад'ездам Ю.Ядкоўскі бярэ шлюб з Галінай Бабpоўскай, дачкой палкоўніка, кіраўніка інстутыта фізічнага выхавання ў Гродне. Шлюб яны бралі ў Вільні ў капліцы Вострабрамскай Божай Маці, вянчаў іх сябра Ю.Ядкоўскага – ксёндз У.Талочка.

З 1937 г. Ю.Ядкоўскі працаваў у мастацкіх зборах Варшаўскага замка. З гэтага часу ён цалкам прысвяціў сябе польскай нумізматыцы. Калі пачалася Другая сусветная вайна, Ю.Ядкоўскі, як і большасць палякаў, апынуўся без працы. Адзінай крыніцай існавання стаў продаж асабістых рэчаў. У канцы 1940 г. удалося ўладкавацца на сціплую пасаду эксперта па продажы старых манет. У гэты час пагоршылася здароўе, якое і раней не было добрым. З-за хваробы Ю.Ядкоўскі страціў працу. У чэрвені 1941 г. у яго нарадзілася дачка Эльжбета-Зоф'я.

У ліпені 1941 года Ю.Ядкоўскі атрымаў працу ў адной з варшаўскіх фірмаў – пасаду кіраўніка аддзела рэстаўрацыі старой мэблі. Адначасова ён супрацоўнічаў з Нацыянальным музеем, дапамагаў ратаваць каштоўныя прадметы ад вывазу ў Германію. Пасля вайны, у маі 1945 г., атрымаў пасаду кусташа Нумізматычнага кабінета ў Варшаўскім музеі, які быў дашчэнту разрабаваны ў вайну. На гэтай пасадзе ён быў да канца сваіх дзён. Ю.Ядкоўскі, які з'яўляўся вядомым знаўцам] сярэднявечнай польскай нумізматыкі, польска-літоўскіх манет, манетнай тэхнікі і нумізматычнай літаратуры, аднавіў дзейнасць Варшаўскага нумізматычнага таварыства.

Але самай важнай справай жыцця Ю.Ядкоўскага стала стварэнне гродзенскага музея, дзе ён здолеў увасобіць сваё бачанне шматграннай гісторыі Гродзеншчыны.

Асновай фондаў музея сталі зборы Камісіі апекі над помнікамі мастацтва і культуры. У іх склад увайшла таксама калекцыя Ю.Ядкоўскага. Многія прадметы былі падораны прыватнымі асобамі, якія збіралі старажытныя рэчы. Аб іх імёнах і дарэннях, а таксама аб прадметах, якія браліся на дэпазіт (на часовае экспанаванне), можна даведацца са справаздач музея. Сярод ахвярадаўцаў былі не толькі прыватныя асобы, але і кляштары францысканцаў і назарэцянак, камендатура паліцыі, магістраты Гродна і Крынак, Таварыства сяброў навук і Дзяржаўны архіў у Вільні, музеі Львова, Варшавы, Кракава.

Жыхары Гродзеншчыны перадавалі музею ўласныя зборы. Адным з пастаянных ахвярадаўцаў быў былы сябра Камісіі апекі над помнікамі – Лявон Вількомскі; цікавыя рэчы, якія належалі сям'і Нямцэвічаў, перадала Зоф'я Урсын-Нямцэвіч з Князевіч; уладальнік палаца ў Свяцку Юзаф Гурскі падарыў музею 113 дакументаў XVI – XVIII стст. па гісторыі Сапоцкінскага краю; Вітольд Урублеўскі перадаў медаль, які атрымаў у гродзенскай гімназіі ў 1862 годзе. Культавыя прадметы перадавалі святары прыходаў. Сярод іх – ксяндзы У.Талочка з Вільні, В.Баневіч з Гожы, Г.Сабалеўскі з Уснаша, В.Сарасек з Вялікай Бераставіцы.

Зразумела, што і сам кусташ музея Ю.Ядкоўскі пастаянна папаўняў фонды за кошт сваіх збораў. Ён перадаў музею калекцыю папяровых грошай часоў Т.Касцюшкі, герцагства Варшаўскага і Каралеўства Польскага, манеты XVIII – пачатку XIX ст., 10 гродзенскіх паясоў, 48 драгічынскіх пломбаў.

Аб тым, як збіраў фонды музея Ю.Ядкоўскі, вельмі маляўніча пісала газета "Dziennik Kresowy". Калі Ю.Ядкоўскі адрамантаваў будынак музея, "тады ён пачаў "ствараць" свой музей. Але як! Апрануў старую адзежу і пачаў вандроўку па паддашшах, крамках, і нават па сметніках… Так, сапраўды! На сметніку дзесьці каля Гродна знайшоў старую карціну Готліба […] Цяжэй за ўсё было з крамкамі. Ідзе сабе Ядкоўскі завулкам Гродна, глядзіць, а тут нейкая яўрэйка загортвае масла ў цудоўную графічную выяву з кнігі, том бясцэннай старой гісторыі выяўленчага мастацтва. Яўрэйка не хоча прадаваць альбом, бо … не знойдзе нідзе "такой добрай паперы" для загортвання масла. Пасля доўгага гандлю, просьбаў і пагроз том быў набыты".

Збіранне фондаў музея Ю.Ядкоўскі падпарадкоўваў сваёй канцэпцыі гісторыі Гродзеншчыны. Абавязкова ў фонды траплялі карціны, мастацкія вырабы заходнееўрапейскіх майстроў, бо, вядома, гэтыя прадметы былі вартымі ўвагі любога музея. Разам з тым робіцца акцэнт на збіранні прадметаў культуры і гісторыі Гродзеншчыны, каб можна было ўбачыць яе багацце і разнастайнасць. Сёння, дзякуючы даваенным зборам, гродзенскі музей мае шмат выдатных экспанатаў. Напрыклад, уніяцкія царскія вароты XVIII ст., якія былі знойдзены на паддашшы Барыса-Глебскага манастыра. Яны з'яўляюцца прыкладам творчасці мясцовых майстроў – як мастакоў, бо на варотах змешчаны жывапісныя выявы архангела Гаўрыіла, Маці Божай і чатырох евангелістаў, так і майстроў па саломапляценню. У даваенным музеі царскія вароты адлюстроўвалі ўніяцкую мастацкую культуру.

Ю.Ядкоўскі імкнуўся сфарміраваць музейны кнігазбор з рэдкіх выданняў. Дзякуючы яго стараннем і настойлівасці, ў музей трапілі кнігі з Гродзенскай публічнай бібліятэкі, якая існавала ў горадзе ў другой палове XIX ст., кнігі з уладальніцкім подпісам ксяндза Гінтаўта – пробашча бернардзінскага касцёла ў Гродне, кнігі з бібліятэкі гродзенскіх кармелітаў, кнігі з пячаткамі бібліятэкі 81-га палка гродзенскіх стралкоў імя Стэфана Баторыя, бібліятэкі Цяцерскіх, частка кнігазбору Казіміра Контрыма – публіцыста, бібліятэкара і сакратара Віленскага ўніверсітэта. Шмат цікавых кніг перадалі школы, музеі іншых гарадоў, выдавецтвы, навуковыя ўстановы. Найбольш каштоўная частка кнігазбору паходзіць з бібліятэкі гродзенскіх дамініканцаў, куды трапіла бібліятэка гродзенскіх езуітаў. На пачатку XIX ст. кнігазбор дамініканцаў налічваў 10.000 альбо 15.000 тамоў тэалагічных і свецкіх кніг XVI – XVIII стст. і рукапісаў. Гэта была адна з найбуйнейшых бібліятэк Літвы і Беларусі. Пасля завірух 1920 г. Ю.Ядкоўскаму ўдалося выратаваць толькі 905 тамоў

старадрукаў . Большасць з іх была ў пергаментных вокладках. Усе яны пазначаны экслібрысамі бібліятэкі гродзенскіх дамініканцаў.

Значнай падзеяй у гісторыі кнігазбору музея было ахвяраванне ў 1927 годзе Мартай Красіньскай каля 10 тысяч тамоў кніг XVI – XIX стст., у большасці па гісторыі наднёманскага краю, зямель Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай. На ўсіх кнігах стаіць штамп "З бібліятэкі Вандаліна Пуслоўскага і Марты Красіньскай". Кнігазбор В.Пуслоўскага (гісторыка, нумізмата, археолага) з Косава ў складзе пасагу яго дачкі Марты патрапіў у маёнтак Свіслач. Дачка папоўніла бібліятэку. Ю.Ядкоўскі, прымаючы гэты дар, планаваў пасля адпаведнай апрацоўкі надаць кнігазбору музея назву "Бібліятэка імя Вандаліна Пуслоўскага і Марты Красіньскай". Дарэчы, гэта назва была надрукавана на картках каталога бібліятэкі музея міжваеннага часу. Багаты збор навуковай бібліятэкі музея дазволіў стварыць у 1991 годзе аддзел рэдкай кнігі і старадрукаў.

У канцы 1922 года пачала фарміравацца калекцыя дакументаў. Значную колькасць матэрыялаў для папаўнення яе сабраў сам Ю.Ядкоўскі. Вялікая колькасць дакументаў XVI – XVIII стст., якія цяпер захоўваюцца ў гэтай калекцыі музея, паходзіць з тых часоў.

Ю.Ядкоўскі займаўся камплектаваннем тэматычнай калекцыі, звязанай з пісьменніцай Элізай Ажэшка. Музей на працягу 1922 – 1937 гг. набыў для яе больш за 300 прадметаў. Гэтыя матэрыялы трапілі ў музей рознымі шляхамі. Так фатаздымак айчыма пісьменніцы, Канстанцыя Відацкага, быў падараваны Урублеўскай. Фатаздымак Э.Ажэшка з сяброўкай і вучаніцай Марыяй Абрэмскай з'явіўся дзякуючы самой М.Абрэмскай. У спадара Цытажынскага былі набыты матэрыялы з аўтографамі пісьменніцы, а таксама адметны гербарны альбом, складзены яе рукамі. Па просьбе Ю.Ядкоўскага Таварыства Элізы Ажэшка ў Варшаве перадало ў фонды музея рукапіс славутага рамана "Над Нёманам", візітоўку з аўтографам, фотаздымкі, засушаныя кветкі і 99 паштовых марак з выявай пісьменніцы. На жаль, многія з гэтых каштоўных матэрыялаў былі страчаны, у тым ліку рукапіс рамана.

Ю.Ядкоўскі быў сапраўдным музейным супрацоўнікам і не мог абысці ўвагай творы народнага мастацтва. На другі год дзейнасці музея ўжо быў створаны аддзел народнага мастацтва "з улікам народных промыслаў". Асабліва трэба падкрэсліць ролю Ю.Ядкоўскага ў першаадкрыцці высокай мастацкай вартасці гродзенскіх падвойных дываноў, вядомым збіральнікам і даследчыкам якіх на працягу амаль дваццаці гадоў ён быў. Упершыню ён дае апісанне дываноў у працы "Народны промысел у Сакольскім павеце", плануе прадставіць іх на выставе народнага мастацтва ў Беластоку. Цяпер калекцыя гродзенскіх дываноў, якую сабраў Ю.Ядкоўскі, захоўваецца ў Музеі Падляшша ў Беластоку.

Сярод вырабаў ганчароў найбольшую цікавасць для Ю.Ядкоўскага ўяўляла поразаўская чорназадымленая кераміка. Па запісах, якія захаваліся, вызначаны 31 прадмет з даваеннай калекцыі поразаўскай керамікі. Гэта ў большасці вырабы ўтылітарнага прызначэння. Таксама ў калекцыі былі прадстаўлены мініяцюрныя сувенірныя і цацачныя вырабы для турыстаў. На адным з гаршчочкаў (КП-7829) ёсць надпіс "Poplawski" – прозвішча аднаго з патомных поразаўскіх ганчароў. Там жа, ў

Поразаве, Ю.Ядкоўскі зрабіў фотаздымак А.Паплаўскага каля печы для абпалу глінянага посуду.

Важнай часткай музейнага фонду сталі матэрыялы, якія былі знойдзены падчас археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся ў Гродне і на Гродзеншчыне. Па сённяшні дзень яны захоўваюцца ў складзе найбуйнейшай калекцыі музея – археалагічнай.

Музей не можа існаваць без музейнай экспазіцыі, таму што яна з'яўляецца "вызначальнай формай існавання музея, якая адлюстроўваецца ў мэтанакіраванай прэзентацыі музейных прадметаў". Першая экспазіцыя Музея ў Гродне была адкрыта ў снежні 1922 года. Агульнае ўяўленне аб ёй можна зрабіць, дзякуючы невялікаму даведніку і некалькім фотаздымкам у выданні "Muzeum w Grodnie" (1923 г.).

Экспазіцыя размяшчалася ў трох залах, а пачыналася яшчэ на лесвічнай пляцоўцы, дзе былі змешчаны жалезныя крыжы (усяго 5) з касцёла дамініканскага кляштара ў Гродне, які быў разабраны ў XIX ст., і малыя жалезныя крыжыкі са старых прыдарожных крыжоў з ваколіц Гродна. Экспазіцыянер (Ю.Ядкоўскі) размясціў іх у самым пачатку экспазіцыі з мэтай стварэння ў наведвальнікаў вобраза, які атаясамліваецца са знакам крыжа – вобраза храма, храма культуры.

Насценны роспіс гэтага памяшкання быў зроблены паводле гравюры М.Цюндта 1568 г. і прадстаўляў від на Стары замак і вялікакняжацкі, пазней каралеўскі палац (Domus Regia), які знаходзіўся на месцы сучаснага Новага замка. Напэўна, Ю.Ядкоўскі не толькі меў намер паказаць самую старую выяву Гродна, але спадзяваўся паўплываць на думкі наведвальнікаў. У даведніку ён піша: "Каб сталі вартымі ўвагі пакоі, дзе калісьці на Старым Замку ў Гродне чуўся голас вялікага Баторыя, дзе часта ён бываў і скончыў жыццё, у тым сеймавым domocilium Яна III, – трэба, каб грамадства прыйшло на дапамогу ў працах, задуманых музеем, важнасць якіх, напэўна, залішне падкрэсліваць".

У першым калідоры знаходзілася карціна (палатно, алей) часоў Яна Казіміра, якая прадстаўляла алегорыю "Танец смерці", магчыма, пэндзля Францішка Лякшыцкага, бернардзінца (нар. у Кракаве, пам. у Гродне ў 1668 г.). У другім калідоры – план Гродна 1797 года, афішы гродзенскага тэатра 1806 года, выявы рэлігійнага зместу, палотны з выявамі невядомых асоб у даспехах сярэдзіны XVII ст., магчыма, пэндзля Ваньковіча.

Залы не мелі назваў, у даведніку яны пазначаюцца нумарамі. У першай зале былі змешчаны археалагічныя знаходкі мясцовага паходжання, якія былі перададзены Ю.Ядкоўскім і Л.Вільконскім з Навагрудка, рэшткі кафлі з замкаў у Троках і Міры, збор народных паясоў з ваколіц Гродна (Друскенікі, Мерач, Новы Двор, Ліпск, Ружанысток) і Беластока (Карыцін), старадаўнія бісерныя вырабы (XVIII – пач. XIX ст.), народныя пісанкі. У гэтай жа зале размяшчаліся помнікі рэлігійнага жывапісу: "П'ета" – фламандскай школы (кан. XVI – пач. XIX ст.), "Спакуса Св. Антонія" Давіда Тэнерса (XVII ст.), "Нараджэнне Хрыста" – італьянскай школы (XVI ст.), "Св. Ганна Трыадзіная" (другая пал. XVIII ст.), "Укрыжаванне" (XVI ст.), "Каранаванне Маці Божай" – пэндзля Яна Шрэйтэня, віленскага мастака (першая пал. XVII ст.), "Зняцце з крыжа" (XVII ст.), "Св. Сямейства" (адзін твор з подпісам "Hilarius Chojecki... ord. praed" ці дамініканец, XVII ст.), абраз "Pasaviensis" (разьба па дрэве, роспіс), які

датуецца канцом XVII – першай пал. XVIII ст. Тут жа быў прадстаўлены дакумент, выдадзены магістратам г. Гродна ў 1575 годзе, які быў замацаваны пячаткай з выявай гарадскога герба (алень Св. Губерта).
У другой зале ў вітрынах экспанаваліся друкаваныя кнігі і рукапісы XV – XVII стст. Заслугоўвалі ўвагі наступныя экспанаты: Біблія, якая была першым выданнем на польскай мове (Кракаў, 1561г.), мела шматлікія гравюры; некалькі супрасльскіх і гродзенскіх выданняў; "Zwierciadło na rozchody y przychody w koronie y z korony" надрукаванае ў 1623 г. у Кракаве, прывілеі з уласнаручнымі подпісамі каралёў Уладзіслава IV, Аўгуста II і Аўгуста III.
У гэтай зале таксама экспанаваліся партрэты караля Яна III Сабескага, Кшыштофа Весялоўскага, маршалка надворнага ВКЛ, яго жонкі Аляксандры з Сабескіх і іх прыёмнай дачкі Грызельды Вадынскай, фундатараў кляштара брыгітак (1642 г) у Гродне; паэта Ю.У.Нямцэвіча (1791 г.) і яго бацькі; Яўстахія Курча, падкаморыя гарадзенскага, фундатара кляштара францысканцаў (1635 г.) у Гродне, і яго жонкі Эўфразыны; маршалка Ляхніцкага пэндзля мастака часоў Станіслава Аўгуста – Ю.Х.Лампега; Станіслава Юндзіла, маршалка Гродзенскага павета і інш. Былі прадстаўлены дзве карціны галандскай школы XVII ст. і адна з найбольш характэрных прац заўчасна памёрлага таленавітага кракаўскага мастака Маўрыцыя Готліба (1856 – 1879) – "Заручыны".
Сярод экспанатаў былі вуглавая шафа, аздобленая манаграмай М.К.Агінскага, жалезны скарбовы куфар з датай "Roku 1718" і замком, механізм якога займаў усё века (з маёнтка Гожа Гродзенскага павета); насценныя падсвечнікі сярэдзіны XVIII ст. (дар ксяндза Г.Сабалеўскага з Уснаша Гродзенскага павета); узоры парчы XVIII ст.
У вялікай вітрыне трэцяй залы былі прадстаўлены нумізматычныя зборы, старадаўняе шкло і кераміка. Заслугоўвалі ўвагі два шкляныя келіхі з раслінным арнаментам, якія паходзілі з мануфактуры Тызенгаўза ў Гродне, пячатка паэта Ю.Урсын-Нямцэвіча з ручкай у выглядзе арла (кан. XVIII ст.), залататканы слуцкі пояс, спражка ад рыцарскага пояса, дзве пячаткі нацыянальных рэвалюцыйных камітэтаў часоў паўстання 1863 года, памятны медаль і мадэль, выкананыя скульптарам С.Левандоўскім з нагоды заняцця Вільні і Гродна ў 1919 г., якія былі набыты за кошт сродкаў, сабраных магістратам г. Гродна.
Асобна знаходзіліся ў экспазіцыі вышыўкі XVII ст. з кляштара брыгітак у Гродне; арнат першай паловы XVII ст., вышыты золатам, срэбрам і жэмчугам; а таксама насценны каляндар XVII ст., план Гродна 1825 года, кальчуга і місюрка XVI ст., марціра пач. XVIII ст. Над вялікай вітрынай вісеў каваны ажурны ліхтар, аздоблены каляровымі шкельцамі (XVIII ст.). У асобнай шафе былі прадстаўлены выданні XV – XVIII стст., якія паходзілі з бібліятэкі дамініканскай гімназіі ў Гродне.

Пераезд у Стары замак зацягнуўся, хаця павінен быў адбыцца ў 1924 годзе. Першыя дзве залы ў замку былі абсталяваны і адкрыты ў лістападзе 1929 года.

У першай зале размяшчалася экспазіцыя, прысвечаная Элізе Ажэшка, а ў другой быў прадстаўлены выдатны кнігазбор Марты Красіньскай. Аўтар імкнуўся прытрымлівацца тэматычнага прынцыпу стварэння экспазіцыі, але гэтыя экспазіцыі хутчэй можна назваць доўгачасовымі выставамі. У гэты час асноўная экспазіцыя па-ранейшаму месцілася ў будынку староства.
У 1931 годзе экспазіцыя музея была пераведзена ў Стары замак, дзе заняла пяць залаў. Для музея была зроблена новая мэбля, жырандолі, крэслы. Да сённяшняга дня ў Старым замку захаваліся дзверы і замкі, зробленыя па праектах Ю.Ядкоўскага.
Уяўленнне аб экспазіцыі музея ў Старым замку цяжка скласці, таму што даведніка ці дакладнага вопісу яе не захавалася. Частковыя звесткі аб ёй змешчаны ў розных

дакументах музея, ёсць некалькі фотаздымкаў. На адным з іх выява залы, якая прысвечана сярэднявечнаму Гродна.




Пасля ад’езду Ю.Ядкоўскага стварэнне новых экспазіцый працягвалася. Афармляецца экспазіцыя, якая дэманстравала вынікі археалагічных раскопак на Замкавай гары. Яе аўтарам хутчэй за ўсё быў З.Дурчэўскі – новы кіраўнік археалагічных даследаванняў у Гродне. Захаваліся вопісы залаў археалогіі, дрэва і архітэктуры, якія былі прадстаўлены наведвальнікам у 1938 (ці ў 1939) годзе.

У зале архітэктуры былі змешчаны выявы помнікаў “рускага” будаўніцтва XII ст., фрагменты гаспадарчага “літоўскага” будынка з дрэва XIV ст., віды замка, планы забудовы Замкавай гары ў розныя часы. Пры гэтым ішоў храналагічны падзел на забудовы XI-XIII cтст., часоў Вітаўта, часоў Баторыя, часоў дынастыі Сасаў. Такім чынам, былі вызначаны перыяды будаўнічых зменаў на Замкавай гары. Таксама тут размяшчаліся 13 архітэктурных фрагментаў з замка, цагліны са сцяны часоў Баторыя, адна з іх мела надпіс “Stanisław Chełchowski”.

У зале дрэва экспанаваліся ўзоры старога дрэва – выявы ці самі зрубы XIV ст., вугаль, фрагмент драўлянага насцілу, а таксама здымкі пластоў дрэва нумар 3-6. Апошняе вызначэнне дрэва па нумарах дазваляе меркаваць, што экспазіцыя была створана пасля раскопак З.Дурчэўскага, таму што ён даследаваў дрэва на Замкавай гары, падзяляючы яго на слаі з нумарамі.




Зала археалогіі прадстаўляла шматлікія артэфакты, а таксама фатаграфіі знаходак.
Музей ствараў не толькі пастаянныя, але і часовыя экспазіцыі – выстаўкі, якія павышалі даступнасць і грамадскую значнасць музейных фондаў ці прыватных збораў.
Ю.Ядкоўскі вёў даволі шырокую дзейнасць па правядзенні выстаў у Гродне. Першая была арганізавана яшчэ ў часы дзейнасці Камісіі апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Яна мела назву “Выстава помнікаў краю і старога Гродна”.

Арганізацыя кожнай выставы патрабавала вялікай падрыхтоўчай працы. Большую яе частку, калі не ўсю, рабіў сам Юзаф Ядкоўскі. Ён асабіста дамаўляўся з мастакамі, атрымліваў (а пасля і адсылаў) мастацкія творы, распакоўваў іх і манціраваў выстаўкі. Сам пісаў анонсы ў мясцовыя газеты, складаў тэксты афіш, запрашэнняў, каталогаў, сачыў за выкананнем друкарнямі музейнага заказу. Ю.Ядкоўскі з удзячнасцю рассылаў каталогі выстаў людзям, якія дапамагалі яму ў стварэнні гэтых выстаў, а таксама розным афіцыйным установам, рабіў справаздачы ў мясцовыя і вышэйшыя ўстановы. Ён сам прымаў наведвальнікаў і праводзіў экскурсіі.
На працягу 1920-х гадоў намаганнямі Ю.Ядкоўскага было арганізавана і праведзена восем выстаў. Выстава мастацкіх твораў у тыя часы была падзеяй сенсацыйнай для Гродна. Але паступова выставачная дзейнасць музея з сенсацыі перарасла ў новую традыцыю горада. Мясцовая газета “Echo Grodzieńskie” пісала аб адкрыцці 24 красавіка 1924 года “Першай вясенняй выставы”, дзе былі прадстаўлены працы віленскага мастака Яўгена Казіміроўскага, наступнае: “Выстава карцін у Гродне? – здавалася, што такая падзея занадта ў нас смелая і адразу асуджана на няўдачу. Таму што да гэтага часу сярэдні гродзенец не толькі пра набыццё, але нават пра агляд карцін не марыў”. Трэба адзначыць, што першыя выставы паглядзела вельмі мала гродзенцаў. Першую наведалі 240 чалавек, а другую – 80 чалавек.




На “Другой восеньскай выставе” (2 – 15 лістапада 1924 г.) былі прадстаўлены мясцовыя краявіды Яцка Мальчэўскага і яго вучняў. Наступныя дзве выстаўкі выяўленчага мастацтва адбыліся пасля значнага перапынку – у 1926 годзе. Гэта былі "Трэцяя выстава твораў Зыха Буйноўскага" і выстава гродзенскага мастака Мар’яна Сланецкага з відамі Гродна і Гродзеншчыны. У гэтым жа годзе адбылася "Чацвёртая выстава праектаў аднаўлення дома імя Элізы Ажэшка" і "Пятая выстава карцін і графікі мастакоў Зоф’і Станкевіч і Мар’яна Сланецкага" (7 лістапада – 2 снежня 1926 г.).

Пасля чарговага двухгадовага перапынку адбылася шостая выстаўка. Яна прадстаўляла творы вядомага далёка за межамі Польшчы мастака Уласціміла Гофмана і эскізы алоўкам яго вучня Станіслава Марка Мазуркевіча (кастрычнік 1928 г.) і праекты адбудовы Старога замка. Наступная выстаўка была прымеркавана да адкрыцця ў Гродне помніка Элізе Ажэшка і прадстаўляла працы аўтара помніка Рамуальда Зэрыха (кастрычнік 1929 г.). Выставы ў асноўным праводзіліся ў старостве, адна з выстаў экспанавалася ў будынку спартыўнага клуба “Kresowia”.

Навуковая дзейнасць з’яўляецца адным з галоўных накірункаў працы любога музея. Яна ўключае апісанне калекцый, правядзенне навуковых канферэнцый, распрацоўку канцэпцый для пастаянных экспазіцый і часовых выстаў, арганізацыю пошукавай працы і іншае – у залежнасці ад профілю музея. У 1920-1930-я гады навуковая дзейнасць гродзенскага музея цалкам залежала ад зацікаўленасцей і даследаванняў яго супрацоўнікаў. Гэты накірунак працы быў прадстаўлены археалагічнай і кансерватарскай дзейнасцю музея.
З самага пачатку дзейнасці музея існавала неабходнасць пераносу збораў у прыдатны для экспазіцыі будынак. Гэта пытанне павінна было вырашацца на ўзроўні мясцовых уладаў. 26 жніўня 1924 года адбылася сустрэча вайсковых і грамадзянскіх улад Гродна для абмеркавання пытання аб перадачы музею часткі замка. На гэтай сустрэчы прысутнічалі гродзенскі стараста К.Рагалевіч, прэзідэнт горада Э.Стэпнеўскі, дырэктар музея Ю.Ядкоўскі і прадстаўнікі вайсковых уладаў. У выніку сустрэчы генерал Л.Бербецкі выдаў загад аб перадачы часткі палаца Старога замка і ўяздной вежы музею на працягу двух тыдняў. Да таго ж планавалася ў найбліжэйшы час аддаць і другія залы замка. На жаль, музей не змог пераехаць у замак да канца 1924 года, таму што вайскоўцы не пакінулі будынак, а таксама не было грашовых сродкаў для рамонту моцна пашкоджаных залаў палаца.

Стварэнне музея ў Старым замку было цесна звязана са справай яго рэстаўрацыі. У 20-я гады XX ст. тут знаходзіліся: бальніца, афіцэрскае казіно, лазня, якая размяшчалася на першым паверсе, таму часта вадой заліваліся сутарэнні. Толькі з пераносам музея ў замак пачынаюцца працы па яго рамонту і ўпарадкаванню тэрыторыі.




Для правядзення прац на замку выдаткоўваліся дзяржаўныя сродкі. З дапамогай Майстэрні польскай архітэктуры ў Варшаве, якая займалася пытаннямі аднаўлення архітэктурных помнікаў, і Камендатуры ўмацаванага лагера ў Гродне ў верасні – кастрычніку 1924 года былі зроблены падрабязныя абмеры замка. Вымярэннямі займаліся студэнты Варшаўскага палітэхнічнага інстытута Я.Клімашэўскі і Б.Жыўна. З дазволу беластоцкага ваяводы на правядзенне гэтых прац былі выкарыстаны крэдыты Аддзела мастацтва і культуры Беластоцкага ваяводства

Паколькі існавала небяспека абвалу не толькі муроў часоў Вітаўта, але і самога будынка палаца на Старым замку, вайсковыя ўлады паабяцалі дапамагчы ў справе ўмацавання Замкавай гары і выдалі адносна гэтага адпаведныя распараджэнні загадам ад 29 жніўня 1924 года. Аб сваёй дапамозе заявіў і прэзідэнт горада Э.Стэпнеўскі. Ён дамовіўся з Упраўленнем водных дарог у Гродне аб будаўніцтве ахоўнага бульвара ля падножжа Замкавай гары. Дзеля гэтага быў зроблены абмер гары. Па загаду генерала Л.Бербецкага яго ажыццяўляў інжынер Е.Брэйхэ, а Упраўленне водных дарог зрабіла вымярэнні глыбіні Нёмана.
Справа рэканструкцыі Замкавай гары патрабавала вялікіх сродкаў і была разгледжана на пасяджэнні Гарадской рады 29 снежня 1924 года. У выдзяленні на рэканструкцыю 10000 злотых было адмоўлена, праўда, было вырашана звярнуцца да ўсіх устаноў, якія

заклапочаны лёсам Замкавай гары ў Гродне, каб наладзіць супрацоўніцтва.
Не чакаючы канчатковага вырашэння пытання, Ю.Ядкоўскі пачаў працы па расчыстцы муроў, каб палегчыць справу правядзення абмераў замка. Падчас прац па даследаванні памяшканняў Старога замка Ю.Ядкоўскім у калідоры, які звязвае ўязную браму з палацам, на другім паверсе былі адкрыты пяць замураваных байніц, схованка і сходы ў сцяне, якія злучалі калісьці верхнюю частку брамы з надворкам. Паралельна Ю.Ядкоўскі пачынае археалагічныя працы. Каля паўночнай сцяны палаца была выкапана траншэя глыбінёй ад 0,5 да 1,5 м, шырынёй 0,6-0,8 м, дзе знайшлі значную колькаць фрагментаў дэкаратыўных аздабленняў палаца: ручка, рэшткі карнізаў, некалькі дзесяткаў аскепкаў featured рознакаляровай паліванай кафлі і іншыя рэчы, якія, па вызначэнні Ю.Ядкоўскага, паходзілі з часоў перабудовы Старога замка пры Стэфане Баторыі і Яне III. Выяўленыя сцены таўшчынёй 2 м даследчык вызначыў як сярэднявечныя. Раскопкі закончыліся 10 лістапада 1924 года з-за пачаўшыхся маразоў.




Існавала пагроза разбурэння пабудоў не толькі на Замкавай гары, але і на суседнім пагорку – вясною 1925 года абвалілася прыбудова да Новага замка. У 1927 годзе асунулася частка Замкавай гары і чакаўся абвал амаль вісячых у паветры рэштак муроў часоў Вітаўта. Падобны лёс пагражаў і ўязной браме Старога замка, што стала відавочным яшчэ ў 1926 годзе. Патрэбны былі тэрміновыя мерапрыемствы па захаванні Старога і Новага замкаў і іх атачэння.

Дзеля ўпарадкавання помнікаў 9 лютага 1928 года быў створаны Камітэт адбудовы замка (Kuratorjum Zamkowy), у склад якога ўвайшлі восем чалавек, сярод іх быў Ю.Ядкоўскі. Са стварэннем гэтага Камітэта пачынаюцца працы па добраўпарадкаванню Замкавай гары. Раман Якімовіч, кіраўнік Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве, які аналізаваў раскопкі Ю.Ядкоўскага, першым даў памылковыя звесткі аб датаванні пачатку земляных

прац. Ён указвае, што працы па ўмацаванні схілаў гары пачаліся пад кіраўніцтвам ваяводскага Камітэта ўшанавання памяці Стэфана Баторыя. Але Камітэт быў створаны ў канцы 1933 года, а працы па ўмацаванні гары пачаліся ў 1928 годзе, аб чым пісаў Ю.Ядкоўскі ў кароткай справаздачы для ваеннага кіраўніцтва.
Трэба адзначыць, што функцыі Камітэтаў былі рознымі. Па словах генерала А.Літвіновіча, кіраўніка Камітэта адбудовы замка, адміністрацыйна-гаспадарчыя і кансерватарскія працы, у тым ліку раскопкі, не павінны ўваходзіць у сферу кампетэнцыі Камітэта ўшанавання памяці Стэфана Баторыя. Ён павінен быў займацца выключна арганізацыяй мерапрыемстваў па святкаванні 400-годдзя караля Рэчы Паспалітай. Таму датай пачатку аднаўленчых прац трэба лічыць менавіта 1928 год, калі быў арганізаваны Камітэт адбудовы замка. Гэтую памылку ўслед за Р.Якімовічам паўтарыў М.М.Варонін, а потым і аўтары калектыўнай працы "Стары замак у Гродне XI – XVIII стст.", дзе пачатак земляных прац на Замкавай гары звязваюць з веснавой паводкай 1932 года, пасля якой узнікла неабходнасць у працах па прадухіленні абвалу муроў часоў Вітаўта.
Праект аднаўлення Старога замка і ўмацавання Замкавай гары быў прадстаўлены на "VI выставе мастацкіх прац Уласціміла Гофмана і праектаў адбудовы Старога замка" ў кастрычніку 1928 года. На выставе былі прадстаўлены: праект пабудовы ахоўнага бульвара ўздоўж Нёмана ад вуліцы Падзамча да вусця рэчкі Гараднічанкі, праект уладкавання падворка Старога замка (аўтар Ю.Ядкоўскі), праекты адбудовы ўязной брамы з узвядзеннем на ёй яшчэ аднаго паверха з дахам у выглядзе шлема (аўтары Б.Збароўскі і Ю.Ядкоўскі), перспектыўныя малюнкі дзядзінца (аўтар Б.Збароўскі), рэканструкцыя разбураных аркад (аўтар Ю.Ядкоўскі), праекты адхілення філяраў у Сеймавай зале (аўтар Ю.Ядкоўскі) і іншыя.




У праекце, распрацаваным Камітэтам па адбудове, былі вызначаны асноўныя мерапрыемствы па аднаўленні Старога замка і добраўпарадкаванні Замкавай гары. Планавалася ўзвесці апоры на пагорку Новага замка, што магло быць выканана толькі пасля зносу старых будынкаў на беразе ракі. На вясну 1929 года планавалася стварэнне тэрасы з балюстрадай каля сярэднявечных муроў з боку Нёмана. Праект прадугледжваў зніжэнне ўзроўню пляцоўкі двара замка на 4,5 м. Гэта рабілася, каб наблізіць двор да ранейшага ўзроўню, калі ён быў на два метры ніжэй. Вызваленую зямлю планавалі выкарыстаць на падсыпку схілаў гары з боку Нёмана. Меркавалася, што гэта дасць магчымасць адкрыць рэшткі старажытных замкавых муроў, якія знаходзяцца пад зямлёй.

Па перакананні Ю.Ядкоўскага, гэта паніжэнне ўзроўню дало б магчымасць доступу да акенца пад абрывам, пра якое хадзіла легенда, быццам гэта ўваход у падземны ход, што вядзе пад самы Нёман, і таму ён стане цікавым для наведвальнікаў замка. Гэта акенца і сёння знаходзіцца ў абарончай сцяне XIV ст., яно бачна з боку Нёмана. У паўночнай частцы замка Ю.Ядкоўскі спадзяваўся знайсці частку падзямелля і рэшткі акруглай сярэднявечнай вежы, якая, па яго меркаванні, тут існавала. Адначасова на падставе навуковых даследаванняў павінны былі распачацца працы па рэстаўрацыі Старога замка.

Галоўны ўваход у замак планавалася перанесці на сярэдзіну будынка, размясціць насупраць галоўных сходаў да бальнай залы (раней Сеймавая зала), прыбіральню з разбуранымі сходамі перарабіць у хол з гардэробам. Сенатарскую залу на першым паверсе, на той момант падзеленую на тры часткі (сталовую, сенцы і гардэроб), рэканструіраваць з той мэтай, каб адсунуць два філяры, на якія абапіраюцца скляпенні. Прэзентацыйную залу часткова зрабіць ніжэй з мэтай схаваць яе верхнюю частку пад новым дахам. Па праекце планавалася прыбраць надбудову часоў Расійскай Імперыі (трэці паверх), якая псавала знешні выгляд будынка. Вялікая ўвага надавалася эстэтычнаму выгляду Старога замка. Таму Камітэт шукаў сродкі на аздобу абрамленняў уваходных дзвярэй і брамы. У замку меркавалася размясціць гісторыка-мастацкі, этнаграфічны і вайсковы музеі.
Трэба адзначыць, што на рэалізацыю праекта патрабаваліся значныя сродкі, якіх не хапала ні ў Міністэрстве грамадскіх прац, ні ў іншых установах. Таму ўжо ў праекце ўказваецца на доўгатэрміновасць работ на Замкавай гары, якія могуць зацягнуцца на два-тры гады. Але гэты тэрмін не з’яўляецца доўгім для правядзення рэканструкцыі па сучасных мерках, таму можна лічыць, што праект павінен быў ажыццявіцца ў досыць кароткі тэрмін.
Цалкам здзейсніць рэканструкцыю і частковае аднаўленне замка не атрымалася. Праблема заключалася ў адсутнасці дастатковых сродкаў. Тым не менш, пэўныя працы былі праведзены. Галоўным вынікам стала стварэнне ў 1929 годзе ахоўнай набярэжнай уздоўж Нёмана, якая звязвала раён Рыбакі (сучасная вул. Рыбацкая) і вул. Падзамча (зараз не існуе), што ішла непасрэдна каля замкаў. Пасля паводак 1931 і 1932 гадоў набярэжная была адрамантавана, у гэтай працы з дапамогай ваяводы М.Зындрам-Касцялкоўскага было задзейнічана 200 беспрацоўных. Такім чынам, ажыццявілася ідэя Ю.Ядкоўскага – стварэнне бульвара ўздоўж Нёмана, пра што ён пісаў яшчэ ў 1924 годзе. Гэтая набярэжная і сёння з’яўляецца месцам адпачынку гараджан. Напэўна, варта было б надаць ёй імя Ю.Ядкоўскага.
У 1933 годзе справы па аднаўленню Старога замка ўзяў на сябе Камітэт ушанавання памяці Стэфана Баторыя. Яго кіраўніком быў генерал Ф.Клеберг. На жаль, крыніцы не захавалі звестак аб тым, чаму кіраўніцтва працамі перайшло ад Камітэта адбудовы замка да Камітэта ўшанавання. Далейшы лёс Камітэта адбудовы невядомы. Камітэт ушанаванння планаваў аднавіць залы замка ў 1936 годзе да запланаванага на гэты год прыезду прэзідэнта Польшчы Ю.Пілсудскага на 350-ю гадавіну смерці караля Стэфана Баторыя ў Гродне.
У час аднаўлення Старога замка музей увёў спецыяльныя білеты на наведванне музея, сродкі ад аплаты якіх ішлі на адбудову замка. На квітках была выява势 планумага выгляду замка і надпіс “50 грошаў замест цаглінкі на адбудову – ахвяра на кансерватарскія працы”.

З 1925 г. пачынаецца паступовы пераезд фондаў музея ў Стары замак. У сакавіку таго ж года паклалі падлогу і асмалілі столевыя бэлькі ў вестыбюлі, пакоях 1, 2, 5 і пакоі над брамай. 15 мая 1929 год адбылося зацвярджэнне праграмы работ на 1929-1930 гг. У першую чаргу планавалася абсталяваць хол, які б адпавядаў прызначэнню замка.




У канцы 1929 года ў Старым замку былі абсталяваны дзве залы. У адной была адкрыта экспазіцыя, якая прысвячалася пісьменніцы Элізе Ажэшка, у другой экспанаваўся кнігазбор, падараваны музею графіняй Мартай Красіньскай. У 1931 годзе экспазіцыя музея, якая працягвала ўвесь гэты час працаваць у старостве, пераязджае ў замак, дзе заняла на той час пяць залаў.

Ю.Ядкоўскі імкнуўся арганічна ўвесці новую экспазіцыю ў каралеўскі палац. Былі выкананы па эскізах кусташа мэбля, свяцільнікі, стылізаваныя пад XVI ст., замоўлены партрэт Стэфана Баторыя ў поўны рост. Гэта экспазіцыя была папоўнена за кошт дарункаў і матэрыялаў, якія былі сабраны падчас экспедыцый, археалагічных раскопак.

Пасля пераезду ў Стары замак замаруджваецца дзейнасць музея: марудна ствараюцца экспазіцыі, змяншаецца колькасць музейных выданняў (у 1923-1929 гг. выйшла 11 выданняў: каталогі выстаў, справаздачы, у 1930-1936 гг. – толькі 3). Гэта адбывалася таму, што Ю.Ядкоўскі актыўна заняўся даследаваннямі Замкавай гары. З другога боку, дзякуючы даследаванням, вельмі добра быў прадстаўлены іншы накірунак дзейнасці музея – навукова-даследчы.

У канцы 1931 года пачаліся земляныя працы па зніжэнні ўзроўню надворка Старога замка, якія сталі пачаткам сенсацыйных для гісторыі Гродна адкрыццяў. Былі знойдзены рэшткі каменных пабудоў XII ст. – княжацкага харама і царквы, што стала яшчэ адным доказам старажытнасці нашага горада. Іх даследаванне здзяйсняў Ю.Ядкоўскі як адзіны на той момант у Гродне спецыяліст у галіне археалогіі і архітэктуры.

На жаль, Ю.Ядкоўскі недастаткова добра валодаў методыкай археалагічных даследаванняў і зрабіў шэраг памылак, якія значна паўплывалі на навуковую вартасць адкрыццяў. Тым не менш нельга замоўчваць яго ролю першага даследчыка, які прыцягнуў увагу грамадскасці да старажытных помнікаў Гродна. У канцы 1933 года кіраўніцтва працамі на Старым замку перайшло да Камітэта ўшанавання памяці Стэфана Баторыя. Па яго ініцыятыве Ю.Ядкоўскі быў зняты з пасады кіраўніка раскопак на Замкавай гары, а замест яго прызначаны З.Дурчэўскі.




Даследаванні на Замкавай гары сталі сенсацыяй у навуковым свеце. Так адзін з артыкулаў, напісаны кансерватарам В.Кешкоўскім і прысвечаны раскопкам у Гродне, меў назву “Гродна – сярэднявечная Троя”. А рускі даследчык А.В.Салаўёў пісаў у 1935 годзе, што раскопкі Ю.Ядкоўскага адкрылі ўнікальныя помнікі XII ст. і вырашылі на карысць сучаснага Гродна пытанне аб знаходжанні летапіснага Гарадзена.

Вынікі археалагічных даследаванняў пашырылі ўяўленне аб гісторыі Гродна. Цяпер вылучаўся і польскімі навукоўцамі перыяд “рускай” гісторыі горада. Знойдзеная Ніжняя царква адназначна была праваслаўнай, што яшчэ раз пацвярджала факт з’яўлення праваслаўя на гэтых землях раней за каталіцызм. Гэта не ўкладвалася ў польскі погляд на гісторыю краю. Нават калі дакладна было вядома, што знайшлі непольскія пабудовы, М.Ліманоўскі так піша пра мінулае Гродна: “Мы знаходзімся на Замкавай гары, якая хавае ў сабе таямніцы. За святыняй мусіць быць дзядзінец, далей дамы баяраў. У гэтым рускім месцы, напэўна, будзе адкрыта лацінская капліца. Калі ў Львове польскія князёўны збудавалі сабе рымскую святыню, чаму б тады ў гэтых часах якая-небудзь польская князёўна не звязала б свой лёс з гродзенскай дынастыяй, збудавала б рымскі санктуарыум і пасылала б малітвы, каб братнія народы Русь і Польшча не ваявалі, а захацелі служыць спакою, будуючы мост як у казцы: Каляровага Усходу і Тэхнічнага Захаду”.

Вынікі раскопак на Замкавай гары сталі нечаканымі для самога Ю.Ядкоўскага. У яго ўяўленні аб гісторыі і культуры Гродзеншчыны яны ўкладваліся не цалкам. З аднаго боку, яны даказвалі старажытнасць горада. Ю.Ядкоўскі лічыў, што Гродна фарміруецца ў XI ст. З другога боку, у сваёй працы “Grodno” ён пісаў, што меркаванне аб валоданні горадам у XII ст. удзельнымі рускімі князямі памылковае, а даследаванні паказалі адваротнае.

Тым не менш ён меў шырокія погляды на гісторыю Гродна. Доказам гэтага стала даследаванне Ю.Ядкоўскім Барысаглебскай ці Каложскай царквы. Такім чынам, гродзенскі музей у асобе дырэктара далучыўся да захавання самага старажытнага архітэктурнага помніка Гродна.

У 1934 годзе былі заўважаны расколіны ў сценах царквы і вырашана арганізаваць спецыяльны Камітэт па аднаўленні святыні на Каложы. У склад яго ўвайшоў Ю.Ядкоўскі. Задачай камітэта ў першую чаргу было ратаванне царквы, таму неабходна было правесці яе даследаванне.

У сваёй кнізе, прысвечанай Каложскай царкве, Ю.Ядкоўскі распавядае не толькі аб выніках археалагічных даследаванняў яе падмуркаў, але і гісторыю самой царквы і манастыра. Даследчык робіць выснову аб тым, што Каложская царква не зведала пажару ад маланкі ў 1183 годзе, таму што слядоў гэтага ён не знайшоў. Але на святыні, адкрытай на Замкавай гары ў 1932 – 1933 гг. (мае на ўвазе царкву XII ст., вядомую як Ніжняя), сляды пажару ёсць у выглядзе спаленага напалову парога, вялікіх кавалкаў вугля і іншых прадметаў. І гэта можа пацвердзіць тое, што звесткі аб спаленай царкве ў Іпацьеўскім летапісе пад 1183 годам тычацца менавіта святыні на Замкавай гары. У выніку гэтыя факты становяцца яшчэ адным пацвярджэннем таго, што летапісны Горадзен з'яўляецца сучасным Гродна, але сам даследчык не называе гэтага факта.
Даследаванні Барысаглебскай царквы, праведзеныя Ю.Ядкоўскім у 1935 годзе, пашырылі навуковыя ўяўленні аб архітэктурных асаблівасцях і гісторыі помніка. Акрамя таго ён звяртаў увагу ўлад і грамадскасці на неабходнасць правядзення прац па ўмацаванню схілаў плато, на якім знаходзіцца царква, бо рэшткам святыні пагражае разбурэнне. Праца Ю.Ядкоўскага, прысвечаная Барысаглебскай царкве, да сённяшняга часу з'яўляецца адзіным манаграфічным выданнем па гісторыі гэтага ўнікальнага помніка Беларусі.

Археалагічная дзейнасць Ю.Ядкоўскага ў Гродне стала адной з крыніц пашырэння яго ўласнага светапогляду на гісторыю гэтых зямель. Гэта змена павінна была праявіцца ў экспазіцыі музея, але даследчык быў адхілены ад кіраўніцтва раскопкамі і выехаў з Гродна.

Пасля аднаўлення Польшчы, ў адпаведнасці з указам 1918 года аб ахове помнікаў гісторыі і культуры, пры Міністэрстве веравызнання і асветы ў 1920 годзе быў створаны Камітэт кансерватараў дагістарычных старажытнасцей — дзяржаўная ўстанова, якая павінна была ахоўваць і вывучаць археалагічныя помнікі. Да 1926 года Камітэт кансерватараў узначальваў прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Уладзімір Антаневіч, затым — дацэнт Раман Якімовіч. Было створана сем кансерватарскіх акруг, у кожную з якіх уваходзілі па два ваяводствы, гэта значыць 35-40 паветаў. Кансерватарам усходніх ваяводстваў (Заходняя Беларусь і Валынь) быў прызначаны Людвіг Савіцкі — спецыяліст па вывучэнні помнікаў эпохі каменя. У 1927 годзе ўрад скараціў пасаду кансерватара ўсходніх ваяводстваў, тэрыторыя якіх увайшла ў распараджэнне варшаўскага кансерватара Р.Якімовіча. Дзяржаўная служба аховы археалагічных помнікаў не была дастаткова мабільнай. З-за недахопу сродкаў і часу нешматлікі калектыў кансерватараў (у 1928 г. іх налічвалася пяць) не заўсёды мог аператыўна рэагаваць на пастпаючыя звесткі аб разбурэнні археалагічных помнікаў [41, с. 83]. Менавіта гэта паўплывала пазней і на стан раскопак Ю.Ядкоўскага ў Гродне.

Паспяховаму выкананню мерапрыемстваў па ахове перашкаджала таксама прыватная ўласнасць на зямлю. Лёс археалагічных помнікаў, асобных знаходак і скарбаў часта залежаў ад волі ўладальнікаў зямельных участкаў, на якіх яны былі знойдзены. Так, напрыклад, дастаткова было згоды старасты і ўладальніка зямлі, каб пачаць раскопкі на Шведскай гары ў Ваўкавыску. У 1920 годзе Ю.Ядкоўскі становіцца кіраўніком Бюро дзяржаўнай апекі над помнікамі гісторыі і культуры ў Гродне і Гродзенскім павеце. Ён вядзе перапіску з кансерватарам беластоцкага ваяводства для вырашэння шматлікіх праблем, без якіх не абыходзілася праца абаронцы помнікаў гісторыі і культуры. Гэта перапіска вялася паміж гродзенскім музеем у асобе дырэктара і рознымі ўстановамі ці прыватнымі асобамі.

Юзаф Ядкоўскі з 1922 года займае пасаду кансерватара Беластоцкай акругі і кіраўніка аддзела мастацтва і культуры ў Беластоцкім ваяводстве. Адным з абавязкаў кансерватара было распаўсюджанне інфармацыі аб нерухомых помніках гісторыі і культуры, якія ахоўваюцца дзяржавай. Ю.Ядкоўскі ад імя Дырэкцыі музея піша лісты з указаннем

помнікаў Гродзенскага павета ў розныя ўстановы з просьбай паведамляць аб парушэннях ў дачыненні рухомых і нерухомых помнікаў каменданту дзяржаўнай паліцыі, рэгіянальнаму архітэктару і інш.

Ю.Ядкоўскі прымаў актыўны ўдзел у справе рэстаўрацыі шматлікіх помнікаў Гродна і Гродзенскага павета. У 1919-1929 гг. ён быў ініцыятарам справы рэстаўрацыі Аўгустоўскага палаца XVIII ст., які быў пабудаваны для Станіслава Аўгуста Панятоўскага – апошняга караля Рэчы Паспалітай. Палац XVIII ст. быў зруйнаваны ў час Першай сусветнай вайны ў 1915 годзе. У 1919 годзе збіраецца камісія ў складзе раённага архітэктара Мікалая Перавоза, дырэктара Музея ў Гродне Ю.Ядкоўскага і з удзелам палкоўніка Цярэнція О'Браена дэ Ласі, уладальніка палаца. Пасля агляду будынка камісія прышла да высновы, што такі помнік вымагае ратавання, асабліва сярэднія рызаліты, аздобленыя манаграмай караля. Для гэтага патрабавалася каля 12000 злотых. У 1923 годзе беластоцкі ваявода просіць прыгатаваць інвентарызацыйныя аркушы з мэтай далучэння палаца да інвентара дзяржаўных помнікаў. Справа адбудовы палаца зацягнулася. Прычынай гэтаму сталі непаразуменні паміж уладальнікамі. У 1928 годзе палкоўнік О’Браен дэ Ласі высякае самыя старыя ліпы ў парку, разбірае на цэглу прыбудовы больш позніх часоў, тое самае плануе зрабіць і з палацам і паведамляе Ю.Ядкоўскаму, што “ў ніякія сантыменты граць не мае намеру”. Праўда, дэ Ласі збіраўся пакінуць сярэднюю частку палаца з гербам, прадухіліць далейшае яе разбурэнне, але выкарыстаць у якасці ўвахода ў парк. Таму Ю.Ядкоўскі звяртаецца за дапамогай да акруговага кансерватара ў Варшаве, каб спецыялісты выканалі абмеры галоўнага фасада палаца. Можна меркаваць, што сталічныя кансервацыйныя ўлады станоўча паўплывалі на ход рэканструкцыі, бо ў маі 1928 года Ц. О’Браен дэ Ласі збіраецца ўжо адбудаваць палац з захаваннем усіх яго асаблівасцей на падставе прамераў, якія захаваліся з даваенных гадоў. Аднак ён просіць аб дапамозе ў 5000 злотых і доўгатэрміновы крэдыт у 12000 злотых, удакладняючы, што адбудова знешняга выгляду палаца вымагае каля 25 тыс. злотых, не лічачы ўласных матэрыялаў. О’Браен дэ Ласі ўсе гэтыя просьбы да кансерватара перадае праз Ю.Ядкоўскага, які звяртаецца з лістом у Варшаву. Гэты ліст быў не апошні, сродкі не паступалі, і Ю.Ядкоўскі быў вымушаны не раз пісаць да кансерватара. Палац Панятоўскага, перажыўшы адну сусветную вайну, напрыканцы наступнай быў зруйнаваны (1944 г.).

У 30-х гадах XX ст. Ю.Ядкоўскі займаўся рэстаўрацыяй палаца ў Свяцку. Захавалася толькі некалькі дакументаў аб гэтай справе. З іх вынікае, што ў гэты час у палацы, які выкарыстоўваўся як шпіталь, праводзіліся працы па аднаўленні паліхроміі. Ю.Ядкоўскі піша ліст да галоўнага кансерватара помнікаў мастацтва Вітольда Кешкоўскага. У лісце змешчана просьба паўплываць на выдзяленне крэдыту для прац па аднаўленні.




Вядома, што ў міжваеннай Польшчы панавалі антысеміцкія настроі. Асабліва моцнымі яны сталі ў 1930-я гады. Паводле дактрыны Р.Дмоўскага, яўрэі для палякаў уяўлялі расава варожы элемент. Яны не павінны былі мець выбарчага права, займаць дзяржаўныя пасады і выконваць вайсковую службу. У палітычнай практыцы гэта дактрына паўплывала на погляды жыхароў Польшчы, робячы з іх антысемітаў.

У 1920-я гады антысеміцкія настроі не былі настолькі моцнымі. У гэты час Ю.Ядкоўскі займаўся пытаннем рэстаўрацыі ўрэнкадэшу (алтара) сінагогі ў мястэчку Воўпа. Прадстаўнікі кіраўніцтва яўрэйскай гміны мястэчка звярнуліся з просьбай аб рэстаўрацыі да ваяводы. У лісце да Ю.Ядкоўскага ён піша аб тым, што патрэбны кваліфікаваны рэстаўратар з Варшавы, а працы будуць цалкам аплачаны кіраўніцтвам гміны. Ю.Ядкоўскі добра ведаў стан сінагогі ў Воўпе, таму што ў 1922 годзе яна была ўнесена ў спіс помнікаў, якія ахоўвае дзяржава, і знаходзілася пад апекай дырэктара музея. Сінагога з'яўлялася помнікам драўлянага дойлідства XVII ст. Гродзенскае староства прапанавала гміне разабраць урэнкадэш на часткі і перавезці ў Варшаву для рэстаўрацыі спецыялістамі пад надзорам З.Ракоўскага, кансерватара беластоцкага ваяводства. Гэта вымагала не так шмат сродкаў у адрозненне ад другога варыянта – прыезду спецыялістаў у Воўпу. Ю.Ядкоўскі павінен быў прысутнічаць пры ўпакоўцы помніка. Але перавоз урэнкадэшу не адбыўся, і прадстаўнікі яўрэйскай гміны яшчэ не раз звярталіся за дапамогай. Дакументаў аб канчатковым лёсе ўрэнкадэшу няма, таму невядома, ці быў ён адрэстаўраваны. Сінагога была зруйнавана падчас Другой сусветнай вайны.

Музей не акцэнтаваў увагу на рэлігійнай прыналежнасці помніка. Дапамога ў ратаванні іўдзейскай спадчыны Гродзеншчыны чарговы раз пацвярджае разуменне супрацоўнікамі музея яе каштоўнасці. Не ставілася пытанне аб польскасці ці няпольскасці помніка, а ішла дапамога па афіцыйнай просьбе.

Ю.Ядкоўскі надаваў вялікую ўвагу рэстаўрацыі каталіцкіх храмаў. На пасяджэнні Камісіі апекі над помнікамі мастацтва і культуры 1 чэрвеня 1920 года была распачата справа рэстаўрацыі касцёла ў Вялікай Бераставіцы Гродзенскага павета, які быў пабудаваны на сродкі Гераніма Хадкевіча ў XVII ст. Справа рэстаўрацыі зацягнулася, нягледзячы на тое, што Ю.Ядкоўскі паведамляў аб касцёле кансерватару ў Варшаве.

У 1934-1935 гг. дырэктар музея зноў займаўся рэстаўрацыяй касцёла ў Вялікай Бераставіцы. У мястэчку было два касцёлы: новы парафіяльны, у якім адбываліся службы, і стары, пра які і пісаў Ю.Ядкоўскі. Ён лічыў, што варта перанесці службы ў стары прыгожы касцёл, які спачатку трэба адрэстаўраваць. Праўда, уладальнікі Бераставіцы, сям'я Касакоўскіх, выступала супраць пераносу службы. Ю.Ядкоўскі прапанаваў ім

зрабіць сваім фамільным маўзалеем новы касцёл, але яны не згаджаліся. Ён звяртаецца да кансерватара Ю.Клюса з просьбай паўплываць на аднаўленне старога касцёла, у якім знаходзяцца каштоўны алтар і скульптуры ў стылі ракако. У далейшай перапісцы з кансерватарам Ю.Ядкоўскі ўказвае на неабходнасць кансервацыі будынка касцёла. Асабліва пашкоджаным быў гонтавы дах касцёла. Ю.Ядкоўскі просіць аб грашовай дапамозе, таму што парафія невялікая (трохі больш за 1500 чалавек), і назбіраць патрэбную суму грошай немагчыма. У 1935 годзе пачаліся працы па кансервацыі касцёла. Спачатку быў запрошаны павятовы архітэктар С.Грахоўскі з мэтай агледзець будынак і даць тэхнічныя парады ў справе ратавання сцен ад разбурэння, а таксама па рамонце даху. У выніку пробашч касцёла атрымаў 500 злотых на кансервацыю будынка, былі праведзены працы па рамонту даху касцёла. Сцены касцёла Візітацыі Дзевы Марыі захаваліся да сённяшняга часу, але будынак па-ранейшаму патрабуе значных рамонтна-рэстаўрацыйных работ.

Адной са сфер дзейнасці музея было аднаўленне, адкрыццё і стварэнне помнікаў вядомым асобам і падзеям. Напрыклад, да музея звярнуўся кіраўнік школы ў Мастах з просьбай аб устаноўцы памятнай дошкі на магіле паўстанцаў 1863 года ў маёнтку Міхайлаўка. Ю.Ядкоўскі згадзіўся дапамагчы, калі не будзе супраць уладальнік маёнтка. У 1935 годзе на магіле быў пастаўлены помнік, запрашэнне на яго адкрыццё было даслана ў музей.

У 1934 годзе Ю.Ядкоўскі прымаў удзел у арганізацыі адкрыцця помніка невядомаму жаўнеру ў Вялікай Бераставіцы. Ён рассылаў запрашэнні, у тым ліку кансерватару помнікаў мастацтва Юзафу Клюсу.

Ю.Ядкоўскі цікавіўся не толькі помнікамі Гродзенскага павета. Падчас стварэння помніка Адаму Міцкевічу ў Вільні ў 1924 годзе ён дасылае мастацкаму аддзяленню Віленскага ўніверсітэта фотаздымак помніка паэту, які ён знайшоў у Румянцаўскіх зборах у Маскве.

Ю.Ядкоўскі займаўся рэстаўрацыяй помніка Яну і Цэцыліі, які знаходзіцца ў в. Багатырэвічы на беразе Нёмана. Прыгожая легенда пра заснавальнікаў роду Багатырэвічаў апісана Элізай Ажэшка ў рамане “Над Нёманам”. У музеі захоўваецца перапіска Ю.Ядкоўскага з рознымі ўстановамі па пытанні рэстаўрацыі помніка ў 1934-1935 гг. Рэстаўрацыяй помніка займаўся скульптар-самавучка Багдан Болдак, якога Ю.Ядкоўскі ведаў даўно. Дзякуючы намаганням многіх людзей – кансерватара мастацкіх помнікаў Ю.Клюса, павятовага інжынера-архітэктара С.Грахоўскага, памочнікаў скульптара студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, – 18 мая 1935 года ў Багатырэвічах, падчас урачыстасцей з нагоды 25-ай гадавіны смерці Элізы Ажэшка, усе прысутныя сталі сведкамі адраджэння помніка Яну і Цэцыліі. Старая скульптура была перададзена ў фонды гродзенскага музея. Фрагменты яе можна бачыць у экспазіцыі Старога замка.



У сферы дзейнасці музея была не толькі ахова помнікаў архітэктуры, але і помнікаў садова-паркавага мастацтва. У 1928-1929 гг. Ю.Ядкоўскі піша аб знішчэнні парка ў маёнтку Галавачы (раней належаў Чачотам) Гродзенскага павета. Новы ўладальнік маёнтка А.Матушынскі пачаў вырубку старых туй і лістоўніц, якія раслі ў англійскім парку – самым значным на той час у павеце. У парку была адзіная ў павеце яловая алея, якая ахоўвалася дзяржавай. Ю.Ядкоўскі просіць гродзенскага старасту прадухіліць вырубку парка і пералічвае артыкулы парушэння заканадаўства. Стараста накіроўвае ўладальніку маёнтка адпаведны зварот са спасылкамі на закон аб ахове помнікаў.
З падобным лістом Ю.Ядкоўскі звяртаецца да старасты ў дачыненні да парка маёнтка Забалаць-Русота Верцялішскай гміны Гродзенскага павета. Новы ўладальнік збіраўся высечы ліпавыя алеі ў гэтым парку, які раней належаў Храптовічам. Ю.Ядкоўскі просіць даслаць ўладальніку маёнтка паведамленне з пералічэннем парушэнняў заканадаўства.
У 1934 годзе быў знішчаны парк у маёнтку Ляхнаў у Індурскай гміне. У ім засталося толькі некалькі некранутых алей, менавіта іх імкнуўся ўратаваць Ю.Ядкоўскі. Былі яшчэ дзве каменныя паркавыя скульптуры, якія таксама трэба было ратаваць. Ю.Ядкоўскі звяртаецца да старасты, каб прадухіліць злачынства.
Трэба адзначыць, што гэтыя паркі не захаваліся. Засталіся толькі невялікія фрагменты былых багатых садова-паркавых ансамбляў.
Музеем пастаянна праводзілася навукова-кансультацыйная дзейнасць. Так Ю.Ядкоўскі шукаў ў фондах музея па просьбах старастаў, школьных настаўнікаў і іншых зацікаўленых асоб інфармацыю пра касцёлы і розныя старыя будынкі. Ён склаў гістарычныя даведкі пра касцёлы ў Жыдомлі, Радзівонавічах, пра будынак “Сукенніца” ў Вялікай Бераставіцы, мястэчка Лунна, Пакроўскі сабор у Гродне і шэраг іншых.
Музей – гэта ўстанова, якая не толькі збірае і захоўвае інфармацыю, але і транслірує яе ў грамадства, і таму асвета становіцца вядучай часткай яго дзейнасці. Самая пашыраная частка асветніцкай дзейнасці – экскурсіі па музеі. Але адзіны супрацоўнік музея не мог шырока займацца правядзеннем экскурсій. Яны адбываліся толькі ў вызначаныя дні тыдня па папярэдняй дамоўленасці з Ю.Ядкоўскім.
Музей спрабаваў спалучаць асветніцкую дзейнасць з навуковай. Так у 1925 годзе ў павятовыя школы былі разасланы спецыяльныя анкеты для збору тапаграфічных дадзеных пра мясцовасць. У іх павінны былі заносіцца звесткі пра мястэчка, вёску ці хутар (геаграфічнае палажэнне, гісторыя, помнікі і г.д.). У выніку гэтыя анкеты станавіліся выдатным матэрыялам па гісторыі Гродзеншчыны.
Асветніцкая дзейнасць праяўлялася ў супрацоўніцтве з рознымі ўстановамі культуры і адукацыі. Ужо ў першы год існавання музея быў створаны праект арганізацыі Таварыства сяброў Музея ў Гродне. З прычыны ўмяшання з боку бяздзейснага Таварыства сяброў навук у Гродне, яно павінна было ўвайсці ў склад апошняга як секцыя. Аднак Таварыства сяброў навук і яго музейная секцыя пасля некалькіх сходаў, якія прайшлі пры вельмі слабым удзеле ініцыятараў і прадстаўнікоў мясцовага грамадства, не сталі жыццяздольнымі. Рабіліся спробы прывесці ў рух Гродзенскі аддзел Польскага краязнаўчага таварыства, які таксама меў на мэце аказанне дапамогі музею. Вынікам стала “Выстава прац экспедыцыі Польскага краязнаўчага таварыства (Гродзенскі аддзел) “Гродна і Гродзенскі павет”, арганізаваная ў прыватным памяшканні, таму што яе характар зусім не адпавядаў задачам Краязнаўчага таварыства, а яшчэ менш – музея.
Адзін з аспектаў асветніцкай дзейнасці – гэта пашырэнне ведаў пра гісторыю Гродна сярод грамадскасці. Ю.Ядкоўскі быў запрошаны Варшаўскім палітэхнічным інстытутам з выступленнем аб адкрыццях на Замкавай гары ў Гродне і калекцыі керамікі, якая захоўваецца ў музеі. Начальнік паліцыі Гродзенскага павета ў 1930 г. звяртаўся да дырэктара музея з просьбай напісаць брашуру пра помнікі і гісторыю Гродна для азнаямлення ўсіх паліцэйскіх.
Нам няшмат вядома пра працу музея пасля 1937 года, калі Ю.Ядкоўскі пакідае пасаду дырэктара і ад’язджае ў Варшаву. Наступным кіраўніком музея стаў Мар’ян Мяшчынскі. Можна меркаваць, што ён праводзіў досыць актыўную дзейнасць. Так у снежні 1938 года

ён піша ліст у гродзенскі аддзел Польскага гістарычнага таварыства, каб запрасіць дэлегата ад гэтай установы на інфармацыйна-справаздачны сход у Старым замку. Такія лісты былі накіраваны і ў іншыя ўстановы, зацікаўленыя ў справе развіцця і дзейнасці музея. Падчас сходу планавалася заслухаць справаздачу аб дзейнасці музея ў 1937-1938 гг., рэферат М.Мяшчынскага "Задачы рэгіянальных музеяў", план будучай дзейнасці і паведамленне аб дабрачынных ахвяраваннях на музей.
Пасада М.Мяшчынскага азначалася як кіраўнік музея, а не дырэктар ці кусташ, як раней указвалася пасада Ю.Ядкоўскага. Магчыма, гэта звязана з тым, што М.Мяшчынскі ўжо не выконваў функцыі кансерватара, як гэта рабіў яго папярэднік. М.Мяшчынскі быў апошнім кіраўніком польскага Музея ў Гродне.
1 верасня 1939 года пачынаецца Другая сусветная вайна, але для Заходняй Беларусі больш важнай падзеяй стала дата 17 верасня 1939 г., калі Чырвоная Армія рушыла праз польска-савецкую мяжу. 20-21 верасня Гродна быў заняты Чырвонай Арміяй.
Падчас баёў у Гродне экспазіцыя музея была пашкоджана, супрацоўнікі наводзілі ў ёй парадак. Салдаты Чырвонай Арміі забралі з музея частку мэблі, пішучую машынку, тэлефонныя апараты.
У лютым 1940 года музей, згодна пастанове Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта (БАВК), быў перададзены Упраўленню мастацкіх спраў з мэтай арганізацыі мастацкага музея. Аддзел мастацтва БАВК прызначыў дырэктарам музея М.І.Крынскага. Аднак афіцыйная перадача музея не адбылася, таму што М.Мяшчынскі ўцёк у невядомым кірунку.
Праз месяц дырэктарам новаствoранага мастацкага музея ў Беластоку быў прызначаны А.М.Бяльковіч, а гродзенскі музей быў перададзены пад яго кіраўніцтва. Памяшканні музея некалькі месяцаў выкарыстоўваліся як склад, у які прывозілі з сядзібаў канфіскаваныя карціны.
У чэрвені 1940 года камісія пад кіраўніцтвам А.М.Бяльковіча складала спіс экспанатаў музея, праводзіла прыняцце фондаў музея. Было прынята 34.172 прадметы, у тым ліку 14.356 кніг, 15.722 манеты і 334 карціны. У гэты склад не ўвайшлі новыя прадметы, таму мы маем уяўленне аб фондзе даваеннага музея. Гэта былі багатыя і разнастайныя мастацкія калекцыі, культавыя прадметы, нумізматыка і інш. Выдатныя фонды сабраў музей на працягу амаль 20 гадоў.

У верасні 1940 г. музей быў перайменаваны ў Гродзенскі дзяржаўны гістарычны музей. Гэта азначала не проста змену шыльды. Карэнным чынам мянялася адукацыйна-выхаваўчая і прапагандысцкая дзейнасць установы. "Калектыў навуковых супрацоўнікаў будучага савецкага музея ставіць сабе за мэту зрабіць з яго сучасную навукова-даследчую і палітычна-асветніцкую ўстанову, зрабіць з яго ўстанову для выхавання сярод мас савецкага патрыятызму, пры дапамозе яго экспазіцыі прапагандаваць сярод рабочых мас навуковыя марксісцка-ленінскія веды". Музей становіцца цалкам установай для прапаганды савецкай ідэалогіі, а навуковая праца адыходзіць на другі план.
Музей у 1939-1941 гг. стварыў новую пастаянную экспазіцыю і праводзіў выставы цалкам ідэалагічнага зместу. Пашыраецца штат супрацоўнікаў, але ў дзейнасці музея ў гэты час не было стабільнасці. Так на працягу трох гадоў змянілася шэсць дырэктараў. Вядома, частая змена кіраўніка ўстановы не на карысць справе.
У гады Вялікай Айчыннай вайны музейныя экспазіцыі былі зачынены, але значных фондавых страт не адбылося. Страты адбыліся пасля вайны, калі частку фондаў музея перадалі іншым музеям БССР і Польшчы.
У гады вайны супрацоўнікі музея займаліся аховай збораў, іх сістэматызацыяй. Вядома, што захавальнікам фондаў быў тады Браніслаў Шушкевіч. За супрацоўніцтва з Арміяй Краёвай ён быў арыштаваны ў канцы 1943 года і загінуў у канцлагеры Штутгаф. На жаль, ваенны перыяд у гісторыі музея застаецца недаследаваным і чакае распрацоўкі.